

ШТО ЗАМІНАЕ СЯМЕЙНЫМ РОДАМ

Сямейная газета

ЭКРАНІЗАЦЫЯ ВЯДОМАГА РАМАНА 16




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ВЕРАСНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 183 (29050)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Генадзь СВІДЗЕРСКІ, першы намеснік міністра прамысловасці:**

*«70 % прадукцыі прадпрыемстваў Міністэрства прамысловасці Беларусі ідзе на экспарт, пастаўкі ажыццяўляюцца ў 100 краін свету. Прадпрыемствы (за сем месяцаў бягучага года) спрацавалі з прыбыткам больш чым у 300 млн рублёў, выраблена прадукцыі больш чым на 9 млрд рублёў. Большая частка прадукцыі экспартуецца — як у Расію, іншыя краіны СНД, так і ў далёкае замежжа. Атрымана станоўчае сальда знешняга гандлю».*

# НА ВЯЧОРКІ Ў ЛЮБОНІЧЫ



Фота БелТА.

**Хочаце аднавіць сапраўдныя вясковыя вячоркі — калі раннімі восеньскімі вечарамі збіраліся ў адной хаце за традыцыйным рыштункам, часалі лён, пралі кудзелю ды воўну, ткалі, а тым часам і спявалі, і жартавалі? Тады вам у Кіраўскі раён, што на Магілёўшчыне. Прынамсі там, у Любонічах (у мясцовым доме культуры) усе патрэбныя для работы прадметы сабраныя ў адным месцы на адмысловай выстаўцы. Сабралі яе руплівцы народнай спадчыны Марыя і Іван САЛАНОВІЧЫ. Увесь рыштунак спраўны — на гэтым фота Марыя Салановіч прадзе на адным з экспанатаў — калаўроце.**

## КОРАТКА

- **У Пекіне пачаў работу найбуйнейшы ў свеце міжнародны аэрапорт Дасін плошчай у 1 млн кв. м. Ён зможа абслугоўваць 45 млн пасажыраў да 2021 года і 72 млн — да 2025-га.**
- На $35 млн прадукцыі па выніках першага паўгоддзя адгрузіў БМЗ на сусветны рынак сталі ў сегменце металапракату для аўтамабілебудавання.
- **Найстарэйшая лячэбная ўстанова Мінска — 2-я гарадская клінічная бальніца сёлета святкуе 220 гадоў з дня свайго адкрыцця.**



- Чэмпіянат Беларусі па фотабёрдынгу пройдзе ў Мінску 6 кастрычніка.
- **У Пінску мужчына ў сварцы з-за нерухомасці пагражаў брату арбалетам.**

Спецыяльны рэпартаж

# ПАТРУЛЬНАЯ ТАЦЦЯНА ЗАСТУПАЕ НА ДЗЯЖУРСТВА

Карэспандэнт «Звязды» прайшлася па маршруце з дзяўчынай-міліцыянерам



**«Яна крочыць па раёне ад двара і да двара, і на ёй зноў пагоны, з пісталетам кабура...» Не, гэта не пра дзядзьку Сцёпу, гэта пра прапаршчыка Таццяну АЗОНЧЫК, якая служыць у роце патрульна-паставой службы міліцыі Савецкага РУУС Мінска. Сустракаемся з ёй каля будынка РУУС. Яна вясёлая і смяшлівая дзяўчына, адразу з ходу расказвае, што аб «пагонах» марыла заўсёды, але не адразу рашылася кінуць сваю работу і пайсці ў міліцыю.**

СТАР. 13

Транспарт

# БЯСПЕЧНЫ ШЛЯХ: ЗІМОЙ І Ў ЦЕМРЫ

### Дарожнікі расказалі, як падрыхтаваліся да снегу і як засцерагчыся на трасе ўначы

**Неабходную колькасць рэчываў для абслугоўвання дарог і забеспячэння на іх бяспекі ўзімку нарыхтуюць ужо ў кастрычніку. А для больш камфортнай язды траса М-1 павінна стаць аўтамагістраллю, ды і хуткасць на сталічных вуліцах таксама трэба павялічваць. Пра гэта і іншыя акалічнасці жыцця аўтадарог расказалі дарожнікі.**

## Хуткасныя праспекты і аўтамагістраль

Дзеля павышэння бяспекі ў цёмны час трэба заканадаўча забараніць рух пешаходаў, веласіпедыстаў, гужавога транспарту і трактарнай тэхнікі на трасах з павышаным хуткасным рэжымам, лічыць **Мікалай ЧАРНЮК, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый.**

СТАР. 4



Фота БелТА.

ISSN 1990 - 763X

Парламенцкі дзённік

# Крокі ў бок даверу

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА узяў удзел у IV Нарадзе спікераў парламентаў краін Еўразіі на тэму «Вялікая Еўразія: Дыялог. Давер. Партнёрства» ў горадзе Нур-Султане (Казахстан). Пра гэта паведамляе прэс-служба ніжняй палаты.**

Сёлета ў міжпарламенцкім мерапрыемстве ўзялі ўдзел больш за 60 замежных краін і 14 міжнародных і міжпарламенцкіх арганізацый. Асаблівасцю IV Нарады з'яўляецца тое, што ўпершыню ў ёй удзельнічалі вядучыя краіны заходняй Еўропы.

У сваім выступленні на нарадзе Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў важнасць канструктыўнага супрацоўніцтва ў галіне эканомікі, што дазваляе сціраць палітычныя межы, ліквідаваць ідэалагічныя штампы і міфалагемы, уносіць тым самым рэальны ўклад ва ўмацаванне ўзаемнага даверу, забеспячэнне бяспекі і зняцце міжнародных канфліктаў.

«Беларусь цвёрда стаіць на гэтай пазіцыі і актыўна прасоўвае яе ў сусветнай супольнасці, — сказаў ён. — Дзякуючы няўхільнаму выкананню ўзятых на сябе міжнародных абавязацельстваў, рэалізацыі мірных ініцыятыў і трывалай рэпутацыі донара рэгіянальнай бяспекі Мінск усё часцей становіцца месцам абмеркавання самых адчувальных праблем міжнароднага парадку».

Спікер ніжняй палаты беларускага парламента нагадаў пра ініцыятыву кіраўніка нашай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі аб перазапуску Хельсінкскага працэсу, якая атрымлівае ўсё большую падтрымку ў міжнароднай супольнасці. Нядаўна Прэзідэнт Беларусі выступіў з прапановай фарміравання «пояса лічбавага добрасуседства». Яе сутнасць — заключэнне міждзяржаўных і іншых пагадненняў аб забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі, заснаваных на ідэях лічбавага суверэнітэту і нейтралітэту, якія гарантуюць неўмяшальніцтва краін у інфармацыйныя рэсурсы адна адной.

На пачатку кастрычніка ў Беларусі адбудзецца чарговая маштабная дыскусія дзеля аднаўлення стабільнасці ў рэгіёне — форум Мінскага дыялогу, які пройдзе пад дэвізам «Еўрапейская бяспека — адысці ад краю бездані».

«Кожнае з такіх мерапрыемстваў мы разглядаем як чарговае звяно ў ланцугу ўзаемазвязаных крокаў, падпарадкаваных агульнай мэце — пабудове новага, больш дасканалага светапарадку», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.

У першы і другі дні нарады старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі правёў двухбаковыя сустрэчы з кіраўнікамі парламентаў Казахстана, Малдовы, Узбекістана, Чэхіі, Расіі, Славакіі, Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Выбары-2019

# ДАСТУПНАЕ ПРАВА ГОЛАСУ

**Прадстаўнікі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў на чарговым пасяджэнні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў абмеркавалі стварэнне дадатковых умоў для ўдзелу ў выбарах асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Пра гэта паведамляе сайт ЦВК.**

На пасяджэнні Цэнтральнай камісіі выступілі і прадстаўнікі Беларускага таварыства інвалідаў, Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, Беларускага таварыства глухіх.

— Безбар'ернае асяроддзе ж не ствараецца адмыслова пад выбары, гэта агульная гуманізацыя грамадства, — пракаментавала журналістам тэму пасяджэння **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА.** — У краіне павінны максімальна ствараць ўмовы для ўдзелу інвалідаў у грамадскім жыцці. Таму Цэнтральная камісія проста будзе прасіць, каб усе ўчасткі для галасавання ў асноўным размяшчаліся на першых паверхах, каб уваходы ў будынак былі абсталяваны пандусамі, калі гэта неабходна, каб ствараліся спецыяльныя месцы для галасавання інвалідаў-калясачнікаў.

Мясцовыя ўлады і выбарчыя камісіі забяспечаць дзяжурства валанцёраў, якія будуць дапамагаць выбаршчыкам з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, пажылым людзям. Грамадзяне, якія слаба бачаць, змогуць скарыстацца лупамі і трафарэтамі.

— Больш за 97 тысяч выбаршчыкаў у нас галасуюць па месцы знаходжання, — паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы Віцебскага аблвыканкама Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ.** — Да цяперашніх выбараў 76,4 працэнта выбарчых участкаў абсталяваны элементамі безбар'ернага асяроддзя. Акрамя таго, для галасавання інвалідаў-калясачнікаў будуць абсталяваны сталы з шырмамі на 687 участках.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый РАЖКОЎ** расказаў пра сітуацыю на Гомельшчыне:

— У нас 1009 участкаў для галасавання. 691 з іх адпавядае патрабаванням безбар'ернага асяроддзя — гэта больш, чым было падчас папярэдніх выбарчых кампаній.

На пасяджэнні ЦВК былі таксама разгледжаны пытанні функцыянавання Інфармацыйнага цэнтра 17—18 лістапада 2019 года. Ён будзе арганізаваны ў будынку Палаца Рэспублікі.

Участкі для галасавання, утвораныя за межамі Рэспублікі Беларусь, пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання прыпісаныя да Купалаўскай выбарчай акругі № 95.

Нагадваем, што выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначаны на 17 лістапада.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Кангрэсе ЗША запусцілі працэс імпічменту Трампа



Палата прадстаўнікоў ЗША абвясціла аб запуску працэсу імпічменту прэзідэнта Дональда Трампа пасля яго спроб прымусіць улады Украіны расследаваць дзейнасць патэнцыйнага саперніка Трампа на выбарах 2020 года Джо Байдэна. Пра пачатак расследавання, якое можа завяршыцца галасаваннем аб імпічменце прэзідэнта ў Палаце прадстаўнікоў, абвясціла спікер палаты Нэнсі Пеласі. Дэмакраты, якія кантралююць ніжнюю палату Кангрэса, абвінавачваюць Дональда Трампа ў злоўжыванні службовым становішчам. Ён прызнаў, што прасіў прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага расследаваць дзейнасць Джо Байдэна і яго сына Хантэра Байдэна, аднак заўважыў, што гэта некарэктна характарызаваць як ціск. Пасля выступлення Пеласі Трамп у твіце назваў абвінавачванні дэмакратаў «паляваннем на ведзьмаў». Для таго каб у Палаце прадстаўнікоў абвясціць імпічмент прэзідэнта, патрабуецца простая большасць галасоў. Аднак далей прэзідэнта судзіць Сенат, і для адхілення кіраўніка дзяржавы ад пасады неабходна ўжо дзве траціны галасоў. Такі парог ні разу ў амерыканскай гісторыі не дасягаўся, да таго ж у гэтым Сенаце большасць маюць дружалюбныя Трампу рэспубліканцы.

## Эканамічны рост у свеце рэкордна замарудзіцца



Глабальны эканамічны рост замарудзіцца да самых нізкіх паказчыкаў за апошнія дзесяцігоддзе. Паводле ацэнак экспертаў Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР), рост ВУП у свеце сёлета акажацца ніжэйшым за прагнозы і складзе 2,9 працэнта. «Думаю, што трэба пачаць турбавацца, — заўважыў галоўны эканаміст АЭСР Лорэнс Бун. — І калі ўрады нічога не зробяць для таго, каб спыніць эскалацыю напружанасці ў гандлі і для развіцця інфраструктуры, то існуе рызыка, што замаруджванне росту працягнецца». Рэкамендацыі АЭСР супадаюць з ацэнкамі Еўрапейскага Цэнтральнага банка — раней рэгулятар заклікаў лідараў прыняць меры. У краінах зоны еўра, па звестках АЭСР, рост ВУП сёлета складзе 1,1 % і 1 % у 2020 годзе. Калі Вялікабрытанія пакіне ЕС са здзелкай і пераходным перыядам, то сёлета ВУП краіны вырасце на 1 % і на 0,9 % — налета. Эксперты папярэджваюць, што рост ВУП Злучанага Каралеўства ў выпадку «жорсткага брэксіту» скароціцца на 2 % і эканоміка сыдзе ў рэцэсію.

## Internet Explorer тэрмінова абноўлены з-за небяспечнай уразлівасці



Карпарацыя Microsoft выпусціла тэрміновае абнаўленне для свайго браўзера Internet Explorer, каб закрыць уразлівасць, якой усё часцей сталі карыстацца хакеры. Гэты дэфект дазваляў зламыснікам усталёўваць на камп'ютары з такім браўзерам шкодныя праграмы. Microsoft заявіла, што ўразлівасць прысутнічала ў версіях 9-11 браўзера IE. Карпарацыя заклікала карыстальнікаў неадкладна загрузіць абнаўленне. Звычайна Microsoft публікуе абнаўленні раз на месяц. Аднак сур'ёзная ўразлівасць прымусіла карпарацыю пайсці на надзвычайную меру. Праблема была выяўленая інжынерам кампаніі Google Клементам Лесіна, які працуе ў аддзеле аналізу пагроз лічбавай бяспекі.

# На пастаяннай сувязі

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 28 верасня ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. У суботу з 9.00 да 12.00 прамыя тэлефонныя лініі правядуць:**

старшыня БРЭСЦКАГА аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА аблвыканкама Анатоль Міхайлавіч ІСАЧАНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

# КАРАВАЙ ПАЦЯЖЭЎ ПРЫБЛІЗНА НА ТРАЦІНУ

**У гэтыя выхадныя ў Браславе пройдуць віцебскія абласныя «Дажынкі». Губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ напярэдадні свята сустрэўся з прадстаўнікамі СМІ, каб адказаць на пытанні, што датычыліся дзейнасці аграпрамысловага комплексу і перспектыў развіцця сельскай гаспадаркі.**



Старшыня аблвыканкама падкрэсліў: дзякуючы падрыхтоўцы да «Дажынак» у райцэнтрах па добрай традыцыі робіцца добраўпарадкаванне, вядзецца капітальны рамонт аб'ектаў сацыяльнай сферы, жылля. Пры гэтым не забываюць і пра іншыя населеныя пункты. І тутэйшыя адчуваюць добрыя перспектывы, асабліва калі паралельна адкрываюцца сучасныя вытворчасці, дзе можна добра зарабляць. Як вынік — моладзь застаецца на малой радзіме, у сем'ях усё больш дзяцей, ды і з вялікіх гарадоў дзеля добрых умоў жыцця і годнай работы пераязджаюць...

Падрыхтоўка да «Дажынак» вядзецца на працягу некалькіх гадоў. Гэта дае магчымасць атрымаць дадатковае фінансаванне з бюджэту Прыдзвіння як ад структур абласнога ўзроўню, так і мецэнатаў.

Што датычыцца вынікаў сёлетняга жніва, то нагода для гонару ёсць, бо ўраджай збожжавых сабралі на 30 % больш, чым летась! Вага каравая вобласці — 980 тысяч тон. А з улікам асабістых падсобных гаспадарак насельніцтва і фермераў — больш за мільён. Калі б не зацяжныя дажджы, як лічыць губернатар, маглі б сабраць яшчэ прыблізна на 200 тысяч тон больш.

Цікава, што Аршанскі раён зрабіў самы вялікі ўнёсак у агульны каравай — каля 119 тысяч тон. Таксама больш чым 100-тысячны намалот у Віцебскага раёна. Сярэдняя ўраджайнасць збожжа склала 29,8 ц/га. Для параўнання, у 2018-м збіралі па 25,1 цэнтнера. Найбольшую ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур атрымалі ў Віцебскім раёне — 39,6 ц/га. На другім месцы — Верхнядзвінскі раён (36,1 ц/га), на трэцім — Гарадоцкі (30,7 ц/га).

Па такім паказчыку, як вытворчасць збожжа на балагектар ворных зямель, Віцебская вобласць, як, дарэчы, і летась, на другім месцы — 106 кілаграмаў. А «золата» ў гэтай намінацыі рэспубліканскага рэйтынгу ў Брэстчыны — 112 кілаграмаў.

Віцебшчыну часта называюць ільняным краем. Сёння на тэрыторыі вобласці вырошчваннем лёну займаюцца восем ільнозаводаў, 12 сельскагаспадарчых арганізацый і льнонасенняспанцыя. Экалагічна чыстыя тканіны і вырабы становяцца ўсё больш папулярнымі, як мовяць, у трэндзе. І попыт павялічваецца, як і цэны. Цяпер працягваецца рэканструкцыя льнокамбіната ў Оршы, мадэрнізаваныя заводы ў Дуброўне і Паставах. А што датычыцца астатніх пяці, лічыць губернатар, трэба будзе вырашыць: ці патрабуе вялікіх выдаткаў мадэрнізацыя, можа, лепш закрыць вытворчасць? Пры гэтым, канешне, людзям, якія там працуюць, трэба знайсці годнае месца новай работы.

Каб павысіць ураджайнасць гэтай культуры, неабходна дакладна прытрымлівацца тэрмінаў пасадкі і збору, выконваць тэхналогіі і забяспечыць працаўнікоў усёй неабходнай тэхнікай.

На Віцебшчыне плануюць раза ў паўтара больш сеяць лён — на ўзроўні 15 тысяч гектараў. У савецкі час даходзіла і да 60 тысяч, таму ёсць да чаго імкнуцца, яшчэ рэзервы не вычарпаны!

«Дажынкі» налета правядуць у абласным цэнтры.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання ЛУКАШЭВІЧА Уладзіміра Васілевіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.**

Найлепшыя

# Вайскоўцы атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды

**У зале Перамогі Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пяць афіцэраў і два прадстаўнікі грамадзянскага персаналу атрымалі з рук міністра абароны Андрэя Раўкова дзяржаўныя ўзнагароды. Адпаведны ўказ 24 ліпеня падпісаў Аляксандр Лукашэнка.**



Фота БелТА.

Сярод іх — старшы лейтэнант Дзмітрый Філіповіч *(на фота справа)*, камандзір вучэбнай мотастралковай роты 307-й гвардзейскай школы падрыхтоўкі спецыялістаў мотастралковых і дэсантных падраздзяленняў 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў. Ён узнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць».

...14 сакавіка гэтага года ў Печах адбылася надзвычайная сітуацыя. Падчас заняткаў па агнявой падрыхтоўцы салдат выпусціў з рук баявую наступальную гранату РГД-5. Дзмітрый Філіповіч, які кіраваў заняткамі, выкінуў свайго падначаленага за межы акопа і закрыў яго сваім целам. Абодва вайскоўцы атрымалі тады раненні мяккіх тканак ног і былі шпіталізаваны.

Сёння, крыху больш чым праз паўгода пасля тых падзей, Дзмітрый Філіповіч успамінае, праз што яму давялося прайсці.

— Зранку пачаліся планавыя заняткі. Усё ішло як мае быць — і ў нейкі момант граната паляцела ў акоп. Салдат выпусціў яе на замаху. Я дзейнічаў па сітуацыі. Загадзя штосьці ў галаве не пракручваў, усё адбылося вокамгненна. Паспрабаваў выкінуць гранату з акопа, але паколькі яго барты былі даволі высокія, зрабіць гэта не атрымалася. Граната ўпала ў куток акопа, што нам і паспрыяла. Я закрыў салдата сваім целам — і граната ўзарвалася. На ўсё было не болей за чатыры секунды. Выбух адбыўся далей, чым у выпадку, калі б я яе не чапаў. Першая думка была: «Што з салдатам?» Усе засталіся жывыя. І я, і той салдат далей праходзім службу ва Узброеных Сілах.

Павел Бацяноўскі скончыў «вучэбку» і па размеркаванні паехаў служыць у 120-ю асобную гвардзейскую механізаваную брыгаду. Вучыцца ён на камандзіра аддзялення.

Таксама Андрэй Раўкоў уручыў ордэн «За службу Радзіме» III ступені начальніку штаба — першаму намесніку камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёру Руслану Касыгіну, камандзіру 361-й базы аховы і абслугоўвання палкоўніку Андрэю Расюку, начальніку ракетных войскаў і артылерыі — начальніку аддзела ракетных войскаў і артылерыі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання палкоўніку Руслану Чэхаву. Ордэнам «Пашаны» ўганараваны намеснік дырэктара па вытворчасці і кіраванні якасцю РУП «Інстытут «Ваенпраект» Сяргей Паўленка. Дырэктар гэтага ж прадпрыемства Сяргей Карпаў атрымаў ганаровае званне «Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь». А начальнік Галоўнага штаба — першы намеснік камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Сяргей Трус узнагароджаны званнем «Заслужаны спецыяліст Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ПЕНСІЯ РУШЫЦЬ УСЛЕД ЗА ВАМІ

## З 1 кастрычніка ўступае ў сілу дагавор з Чэхіяй аб пенсійным забеспячэнні

**Падпісана Адміністрацыйнае пагадненне аб прымяненні Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Чэшскай Рэспублікай аб пенсійным забеспячэнні ад 14 сакавіка 2018 года.**

Адміністрацыйнае пагадненне ўступіць у сілу адначасова з Дагаворам — з 1 кастрычніка 2019 года. Яго рэалізацыя ў частцы пенсійнага забеспячэння дазволіць забяспечыць грамадзянам, якія жывуць у Беларусі і Чэхіі, атрыманне пенсіі за стаж працы, набыты на тэрыторыях названых дзяржаў.

У Мінпрацы і сацабароны нагадваюць, што гэты дагавор рэгулюе пытанні выплаты ўнёскаў на абавязковае дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і прызначэння і выплаты пенсій: у Беларусі — працоўных пенсій па ўзросце, за выслугу гадоў, па інваліднасці, з нагоды страты карміцеля; у Чэхіі — па ўзросце, па інваліднасці, удаве (удаўцу), сіраце.

Пенсіі будуць прызначацца кожнай дзяржавай за свой стаж і выплачвацца на тэрыторыі дзяржавы пражывання грамадзяніна. Выплата пенсій з Беларусі ў Чэхію і наадварот будзе ажыццяўляцца ў еўра шляхам залічэння непасрэдна на асабовы рахунак пенсіянера ў банку дзяржавы пражывання.

У выпадку пераезду чалавека з Беларусі ў Чэхію і наадварот, з Чэхіі ў Беларусь, за ім будзе рухацца прызначаная яму пенсія за стаж, набыты на тэрыторыі дзяржавы выезду.

Таксама прадстаўнікі Мінпрацы растлумачылі, што па пытаннях пенсійнага забеспячэння з улікам палажэнняў дагавора неабходна звяртацца:

асобам, якія пастаянна пражываюць у Беларусі, — у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства ў Беларусі,

асобам, якія пражываюць у Чэшскай Рэспубліцы, — у тэрытарыяльныя органы Чэшскага ўпраўлення сацыяльнага забеспячэння па месцы жыхарства ў Чэхіі.

**Святлана БУСЬКО.**

Запрашальнік

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ

## Манеты і банкноты за 25 гадоў існавання

**У пачатку кастрычніка ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі «Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці» пройдзе ўрачыстае адкрыццё выстаўкі «Беларускі рубель. Гісторыя ў чвэрць стагоддзя».**

І сапраўды, сёлета 19 кастрычніка спаўняецца 25 гадоў з моманту прыняцця Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь пастановы, якая заканадаўча замацавала беларускі рубель у якасці адзінага законнага плацежнага сродку на тэрыторыі краіны. Гэтае рашэнне стала заключным этапам у працэсе набыцця беларускім рублём статусу нацыянальнай грашовай адзінкі.

У Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці будзе прадстаўлена часовая экспазіцыя, прысвечаная гісторыі фарміравання і станаўлення наяўнага грашовага абарачэння ў нашай краіне. Матэрыялы экспазіцыі адлюстроўваюць храналогію станаўлення і развіцця беларускага рубля, пачынаючы з 1990-х гадоў і заканчваючы днём сённяшнім.

У экспазіцыі будуць упершыню прадстаўлены дакументы і прадметы, якія ілюструюць працэс распрацоўкі і фарміравання грашовай сістэмы ў краіне. Гэта і камплекты фотаформаў элементаў малюнкаў разліковых білетаў Нацыянальнага банка 1992 года, друкаваныя праекты грашовых знакаў, у тым ліку не выпушчаных у абарачэнне. Асобным блокам будзе адлюстравана работа Нацыянальнага банка па выпуску памятных і юбілейных манет.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## У МЁРАХ АДБЫЎСЯ ВЫКІД АМІЯКУ

**Перад абедам у Мёрскае раённае падраздзяленне МНС паступіла паведамленне пра выкід аміяку ў цэху Полацкага філіяла ААТ «Малако».**



mchs.gov.by

Ратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, устанавілі, што ў выніку разгерметызацыі зварнога шва халадзільнай устаноўкі на ўчастку ад выпарніка да вільгацеразмеркавальніка адбыўся выкід аміяку. Персанал аб'екта самастойна пакінуў тэрыторыю прадпрыемства, работа была часова прыпынена. У радыусе 200 метраў ад месца надзвычайнага здарэння размешчана ўстанова адукацыі. Ратавальнікамі з будынка школы ў бяспечнае месца эвакуіраваны 560 дзяцей і 110 чалавек персаналу, паведамілі ў МНС.

Для ліквідацыі няштатнай сітуацыі звяном газадымаахоўнай службы былі створаны дзве загараджальныя заслоны. Менш чым праз гадзіну пасля паведамлення пра здарэнне зварное шво загерметызавалі спецыялісты. У выніку ніхто не пацярпеў, прычына таго, што адбылося, высвятляецца.

## ЗУБРЫ ПА АБМЕНЕ

**Такую магчымасць разглядаюць Беларусь і Румынія. Адпаведная дамоўленасць была дасягнутая па выніках афіцыйнага візіту міністра лясной гаспадаркі Беларусі Віталя Дрожжы ў гэтую краіну, перадае прэс-служба ведамства.**

Пакуль гаворка ідзе пра некалькі асобін. Галоўная мэта абмену — паляпшэнне генетычнага фонду жывёл. У Румыніі назіраецца лішак самцоў зубра, у той час як у Беларусі — супрацьлеглая сітуацыя: самак больш, чым самцоў. Адбываецца такое галоўным чынам з-за таго, што зуброў у Румыніі ўтрымліваюць у вальерах, а гэта перашкаджае рассяленню самцоў на іншыя тэрыторыі. Мяркуецца, што абмен будзе здзейснены паміж разнаполымі жывёламі.

У Мінлясгасе адзначаюць, што румынская папуляцыя ў асноўным фарміравалася за кошт зуброў з Польшчы і Балгарыі. У Беларусі, у сваю чаргу, налічваецца некалькі папуляцый, найбуйнейшая з якіх — Асіповіцкая. Менавіта яе прадстаўнікоў кіраўніцтва міністэрства разглядае ў якасці магчымых асобін для абмену.

У цэлым на рэалізацыю праекта можа сысці два гады. Першапачатковы этап — выбудоўванне канцэпцыі абмену, затым падрыхтоўка неабходнай дакументацыі, далей — транспарціроўка жывёл, іх усяленне.

Вывучэнне асаблівасцяў вядзення паляўнічай гаспадаркі стала адной з ключавых задач афіцыйнага візіту кіраўніцтва галіны. Міністр наведаў у Румыніі музей палявання і лясы, пабываў у гадавальніку зуброў, а таксама на ферме фазанаў.

У міністэрстве нагадалі, што раней беларускімі зубрамі зацікавіліся таксама ў Малдове. У ходзе афіцыйнага візіту прадстаўнікоў Агенцтва «Молдсілва» да нас былі дасягнуты дамоўленасці аб абмене двух самцоў зубра з заказніка «Пэдура Домняскэ» на дзвюх самак гэтага віду дзікай жывёліны з рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі».

## НЕШТА НЕ ТОЕ «ГАТАВАЛІ» ТЫЯ КУХАРЫ...

**Супрацоўнікамі наркакантролю Першамайскага РУУС сталіцы ў розных раёнах горада ў адзін дзень затрыманы два кухары, у якіх пры сабе былі выяўленыя і канфіскаваныя забароненыя рэчывы.**

У аднаго, 24-гадовага шаўрміста, аператыўнікі знайшлі каля трох грамаў гашышу. А ў старэйшага калегі, 32-гадовага кухара паназіяцкай кухні, пры сабе была доза асабліва небяспечнага псіхатропа MDMA, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.

Пры аглядзе кватэры апошняга супрацоўнікі наркакантролю выявілі запамінальную прыладу, на якой захоўвалася інфармацыя пра схованку-закладку з экстазі. У далейшым аператыўнікамі былі правераныя названыя каардынаты: у лясным масіве ў Мінскім раёне знаходзіўся тайнік, дзе было выяўлена 100 таблетак псіхатропнага рэчыва MDMA.

Мужчына растлумачыў супрацоўнікам міліцыі, што забароненае рэчыва буйнымі партыямі ён набываў праз інтэрнэт-краму і забіраў у закладках. Цяпер гэтая інфармацыя правяраецца, аператыўнікі ўстанаўліваюць канал пастаўкі наркотыкаў, а таксама кола асоб, якія маюць дачыненне да незаконнага абароту забароненых рэчываў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДАКРАНУЛІСЯ ДА ГІСТОРЫІ

**У парку-музеі інтэрактыўнай гісторыі «Сула», што ў Стаўбцоўскім раёне, дадзены старт чарадзе сустрэч, прысвечаных культурнай спадчыне нацыянальнасцяў, якія традыцыйна пражываюць у нашай краіне поруч з беларусамі. Першы міні-фэст адбыўся ў мінулыя выхадныя і быў прысвечаны беларуска-польскім традыцыям, якія на працягу стагоддзяў існавалі на нашых землях.**

Падчас свята можна было пабачыць польскія і беларускія танцы, пачуць сучасныя і старадаўнія песні, паўдзельнічаць у майстар-класах. Госці акунуліся ў атмасферу жывой беларускай і польскай мовы, пачаставаліся нацыянальнымі стравамі. У Калегіуме іх чакалі выступленне хору польскай песні, у выкананні якога прагучала духоўная музыка, а таксама міні-канцэрт на фісгармоніі XIX стагоддзя ад пана Тадэвуша. Праграма дня прадугледжвала і выступленні калектываў «Cantus Cordis», «Маёвы Квят», «Карагод» ды шмат іншых.

Стварыць атмасферу старадаўняй польска-беларускай шляхецкай культуры дапамаглі ўдзельнікі клубаў гістарычнай рэканструкцыі і тэатральных суполак. На шляхецкай пляцоўцы падчас імпрэзы госці не проста ўбачылі строі ды зброю мінулых эпох, але ж і дакрануліся да жывой гісторыі, стаўшы ўдзельнікамі майстар-класаў па валоданні польскай шабляй і гледачамі сапраўдных міні-спектакляў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# БЯСПЕЧНЫ ШЛЯХ: ЗІМОЙ І Ў ЦЕМРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— На жаль, часам пры вялікай хуткасці з аўто проста немагчыма заўважыць габарыты трактара. Гэта не наша адкрыццё. Ва ўсім свеце на такіх трасах забаронены рух падобных катэгорый транспарту. І першая дарога, дзе мы плануем зрабіць гэта, — траса М-1/Е30 (Брэст — граніца РФ). Неабходна сур'ёзна рэканструяваць яе, як мы рабілі гэта на першай Мінскай кальцавой. Там, канешне, таксама захоўваецца частка праблем, але дарога пацвердзіла, што гэты напрамак з'яўляецца выключным у плане бяспекі руху. І мы бачым, што, калі мы прыбралі з яе святлафоры, абсталявалі ўсе пешаходныя пераходы на розных узроўнях, поўнасцю зрабілі падзяленне палос руху, гэта спрацавала. Тым не менш на кальцавой 30 гадоў таму было менш за 20 тысяч карыстальнікаў, а паказчыкі небяспекі там былі ў разы вышэйшыя, чым цяпер, калі па ёй ездзіць 100 тысяч пры хуткасці 90—100 км/г, — адзначыў Мікалай Чарнюк.

Дарога М1 павінна стаць аўтамагістраллю, аднак перад гэтым на ёй трэба зрабіць усё, што было створана на Мінскай кальцавой, і яшчэ звыш таго. Напрыклад, вынесці аўтобусныя прыпынкі за межы дарожнага палатна.

— На некаторых дарогах у нас ужо зроблены падобныя фрагменты, калі аўтобус спыняецца не на ўзбочыне, якая сумешчана з праезнай часткай, а выязджае за агароджаную зону. Аднак гэта адзінкавыя прыклады.

Хуткасныя параметры ў горадзе таксама неабходна павялічваць, бо на асобных трасах мы ўжо на мяжы затораў, і гэта не дадае бяспекі руху.

## Рамонт і рэканструкцыя

Сёлета скончыцца рамонт аўтадарог М1 і М6 (Мінск — Гродна), а налета пачнецца рэканструкцыя трасы М7 (Мінск — граніца Літвы).

Усе планы па бягучым і капітальным рамонце ў цэлым забяспечваюцца, ахарактарызаваў работу галіны прадстаўнік Мінтрансу.

— Нават па асобных напрамках, дзе ў нас за апошнія гады былі істотныя разбурэнні. На такіх дарогах, як М1, выканаем рамонт, тым самым забяспечыўшы для карыстальнікаў і эксплуатацыйных арганізацый больш камфортныя і бяспечныя ўмовы.

Спецыяліст адзначыў, што сёлета поўнасцю будзе завершана траса М6: нават на тых участках, якія не трапілі пад рэканструкцыю і былі пабудаваны раней па першай катэгорыі, правядуць бягучы рамонт і адновяць усе эксплуатацыйныя параметры гэтай трасы ў поўным аб'ёме.

— Застанецца толькі невялікі кавалак ад 57-га кіламетра да Хацежына, дзе мы апошнія гады не праводзілі рэканструкцыю. Гэты ўчастак будзе капітальна адрамантаваны налета, як і ўся дарога М7, якая вядзе ў Вільнюс. Дарога фінансуецца за кошт крэдытаў міжнародных фінансавых інстытутаў, і ўсе асноўныя дакументы ў гэтай частцы ўжо падпісаны, — удакладніў Мікалай Чарнюк. — Амаль скончаны работы і на трасе Р80 (частцы 2-й кальцавой, якая звязвае трасы з Мінска ў Віцебск і з Мінска ў Нацыянальны аэрапорт) па параметрах першай катэгорыі. Іншыя важныя аб'екты таксама будуць забяспечаны ўводам у эксплуатацыю згодна з нашымі праграмамі, зацверджанымі на наступны год.

Сталічная дарожная сетка сёлета таксама абнавілася, паведаміў **Алег ЛУКАШЭНКА, намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання «Гаррэмаўтадар Мінгарвыканкама» па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання.** На 124,4 тысячы метраў мінскіх вуліц ліквідавана крытычная ямкавасць. Адрамантавана 1750 квадратных метраў шумазасцерагальных экранаў і падпорных сцен, 111 тысяч метраў тратуараў, 35,7 кіламетра бартавога каменю, 3311 калодзежаў дажджавой каналізацыі, 1425 пагонных метраў металічнай бар'ернай агароджы. На 251 кіламетры дарог залітыя трэшчыны.



## Супраць лёду і снегу

Дзевяць пляцовак для часовага складзіравання снегу і снегаплавільны пункт, дзе за суткі можна перапрацаваць да пяці тысяч кубічных метраў сезонных ападкаў, будуць дзейнічаць зімой у сталіцы. Штосутачна будзе працаваць 700 адзінак спецтэхнікі і 800 прыбіральшчыкаў тэрыторыі, запэўніў Алег Лукашэнка:

— Падрыхтоўка снегаўборачнай тэхнікі і абсталявання да работы зімою вядзецца адпаведна з распрацаваным графікам, на кожную адзінку тэхнікі складаецца акт гатоўнасці. Да 5 лістапада завершыцца пераабсталяванне прылад. Па меры завяршэння работ па пераабсталяванні пескаразмеркавальная тэхніка пройдзе атэстацыю на мінімальныя нормы размеркавання супрацьгалалёдных рэагентаў.

Да 10 кастрычніка поўнасцю завершаць нарыхтоўку асноўных супрацьгалалёдных і іншых матэрыялаў для апрацоўкі дарожнага палатна. Пакуль іх назапашана 80 % ад неабходнай колькасці, кажуць дарожнікі. Яны запэўнілі, што гатоўнасць эксплуатацыйнай тэхнікі таксама даволі высокая, а ўсе работы будуць выкананы ў час.

Летась сталічныя дарожнікі набылі 14 спецмашын і шэсць адзінак абсталявання для ўборкі снегу. Так што ў сёлетняй зімовай кампаніі будзе ўдзельнічаць не менш за 760 адзінак тэхнікі: камбінаваныя дарожныя машыны, плужна-шчотачныя, снегапагрузчыкі, солеразмеркавальнікі, самазвалы для вывазу снегу.

Каб выключыць збоі ў рабоце транспарту зімою, дарожнікі заключылі дагаворы з 35 арганізацыямі. Пры неабходнасці да работы дадаткова падключыцца да 350 адзінак спецтэхнікі, пераважна самазвалаў.

Апрацоўваць мінскія дарогі будуць пясчана-саляной сумессю і чыстай соллю «Галіт» маркі А. Да 15 кастрычніка іх нарыхтуюць у неабходнай колькасці. А для бяспекі жыхароў і аператыўнага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі, што могуць узнікнуць падчас вялікіх снегападаў ці рэзкага паніжэння тэмператур, прадугледжаны адпаведны план дзеянняў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Бяспека на дарозе

## ДТЗ: жыццё да і пасля

**На дарогах Беларусі ў ДТЗ штогод атрымліваюць шкоду здароўю тры з паловай тысячы чалавек. Каля трох працэнтаў з іх доўгі час знаходзяцца ў вегетатыўным стане. Гэта значыць, што ў іх істотна пашкоджаны галаўны мозг. Яны не рэагуюць на самога сябе і на навакольны свет, хоць працягваюць жыць.**

Першы ў краіне адмысловы цэнтр дапамогі такім людзям і іх сваякам адчыніў дзверы 26 верасня ў Рэспубліканскім клінічным шпіталі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Адбылося гэта пры садзейнічанні дабрачыннага фонду «Бяспечныя дарогі». Ён інвеставаў у адкрыццё цэнтра вялікія грошы — 250 тысяч еўра.

Як зазначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення медыцынскай экспертызы Міністэрства аховы здароўя Ірына КІРЭЕВА,** у цэнтры будзе арганізаваны рэгістр пацыентаў, якія знаходзяцца пасля ДТЗ у вегетатыўным стане, а сваякоў навучаць прыёмам догляду за такімі хворымі. Цэнтр аснашчаны самым сучасным абсталяваннем і разлічаны на шэсць ложкаў. Першыя пацыенты ўжо праходзяць у ім лячэнне.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Дзвярыма аўто пашкодзіў аўтобус

**Кур'ёзнае дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ў горадзе над Бугам.**

Як паведамляе УУС Брэсцкага аблвыканкама, 29-гадовы мужчына на аўтамабілі «Таёта Прыус» (таксі) прывёз чарговага нецвярозага пасажыра на вуліцу Гвардзейскую ў мікрараёне Паўднёвы. Кіроўца спыніў машыну каля краю праезнай часткі. Паглядзеўшы ў люстэрка задняга віду, ён убачыў, што ззаду набліжаецца аўтобус, і сказаў пасажыру не адкрываць дзверы, пакуль аўтобус не праедзе. Аднак пасажыр альбо не пачуў, альбо не звярнуў увагі на просьбу кіроўцы. І ў той момант, калі аўтобус практычна праехаў міма аўтамабіля, пасажыр вырашыў выйсці і адкрыў левыя заднія дзверы, пашкодзіўшы кузаў аўтобуса.

Пры складанні адміністрацыйнага пратакола было ўстаноўлена, што кіроўца таксі не меў права кіравання, паколькі быў яго пазбаўлены за неаднаразовае перавышэнне хуткасці руху. Аналагічны пратакол складзены ў дачыненні да ўладальніка аўтамабіля (за перадачу права кіравання асобе, якая не мае такога права).

Пасажыр, 48-гадовы брастаўчанін, у гэтай гісторыі таксама не застаўся беспакараным: і ў яго дачыненні быў складзены адміністрацыйны пратакол.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Воложинское районное потребительское общество, Минская обл., г. Воложин, ул. Партизанская, 30 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Населенный пункт |
|---|---|---|---|---|
| **Здание магазина № 165** | здание специализир. розничной торговли | 95 кв. м | 632/С-29654 | Минская обл., Воложинский р-н, Раковский с/с, д. Бузуны, ул. Лейтенанта Воробьёва, 28А |

Составные части и принадлежности: уборная

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,15** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 22.07.2068) для обслуживания здания магазина № 165

**Начальная цена с НДС 20 % – 40 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лоту № 7 опубликовано в газете «Звязда» от 02.10.2018

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 30.10.2019** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 28.10.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организацтор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**
Продавец: ОАО «Крупский плодоовощной завод» (УНП 600025392) в лице ликвидатора ООО «Партнер-Консультант», тел. +375 (17) 395-58-91.
Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **8 октября 2019 г. 09.00—17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Емкость 7 $м^3$ инв 4290753 | 720,00 |
| 2 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 4290754 | 1296,00 |
| 3 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 4290755 | 1296,00 |
| 4 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 4290756 | 1296,00 |
| 5 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 429757 | 1296,00 |
| 6 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 450103 | 1296,00 |
| 7 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 450104 | 1296,00 |
| 8 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 450105 | 1296,00 |
| 9 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 450106 | 1296,00 |
| 10 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 450107 | 1296,00 |
| 11 | Емкость б/у 15 $м^3$ инв 4290964 | 1296,00 |
| 12 | Емкость б/у 16 $м^3$ инв 4290782 | 1296,00 |
| 13 | Емкость б/у 16 $м^3$ инв 4290780 | 1296,00 |
| 14 | Емкость б/у 16 $м^3$ инв 4290781 | 1296,00 |
| 15 | Емкость 20 $м^3$ инв 4290758 | 1440,00 |
| 16 | Емкость 20 $м^3$ инв 4290760 | 1440,00 |
| 17 | Емкость 20 $м^3$ инв 4290759 | 1440,00 |
| 18 | Емкость 50 $м^3$ инв 4290752 | 3456,00 |
| 19 | Емкость 16 $м^3$ инв 4290762 | 1296,00 |
| 20 | Емкость 16 $м^3$ инв 4290761 | 1296,00 |
| 21 | Емкость 16 $м^3$ инв 4290763 | 1296,00 |
| 22 | Емкость 16 $м^3$ инв 4290764 | 1296,00 |
| 23 | Емкость 16 м инв 4290765 | 1296,00 |
| 24 | Емкость 16 $м^3$ инв 4290768 | 1296,00 |
| 25 | Емкость 16 $м^3$ инв 4290769 | 1296,00 |
| 26 | Емкость 16 м инв 4290770 | 1296,00 |
| 27 | Бракиражная машина В6-ВИА инв 450062 | 396,00 |
| 28 | Машина моечная АММ 6 инв 450061 | 4860,00 |
| 29 | Автомат для укупорки Л5-ВУВ инв 450124 | 1224,00 |
| 30 | Этикетировочный автомат Л5-ВЭ2М инв 450064 | 1656,00 |
| 31 | Вибробункер Л5-ВБК инв 450074 | 208,80 |
| 32 | Устройство для переворачивания В6-ВИА инв 450125 | 396,00 |
| 33 | Машина фасовочная Д9-ВРЕ6 инв 450076 | 2736,00 |
| 34 | Автомат наклеивания марок АНМК-4 инв 450065 | 1008,00 |
| 35 | Водонагреватель инв 450113 | 115,20 |
| 36 | Комплект транспортеров Б-2 | 2332,80 |
| 37 | Аппарат упаковочный инв 430029 | 511,20 |
| 38 | Котел паровой Е-1,0-0,9Р-3 (Э) инв 430114 | 6552,00 |
| 39 | Разливочный аппарат | 1224,00 |
| 40 | Котел паровой Е-1,0-0,9Р-3 (Э) | 6552,00 |
| 41 | Центрифуга | 86,40 |

Местонахождение — г. Крупки, тел. для ознакомления — + 375 29 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 07.10.2019 г. 17.00**
1) зарегистрироваться и подать заявку на участие в торгах по выбранному лоту на сайте **BELTORGI.BY**, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель — ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов — 5 %, задаток — 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 03.08.2019 г.

Сямейная газета

Выпуск № 13 (131)

# ШТО З НАС ВЫРАСЛА

Днямі патэлефанавала прыяцелька, падзялілася абурэннем: 12-гадовы сын, што называецца, без абвяшчэння вайны прыйшоў дадому з ярка-чырвоным чубам. Тата хмыкнуў і параіў для камплекту адрасціць рознакаляровы пеўневы хвост. Мама схапілася за сэрца, уяўляючы, што скажуць настаўнікі, асабліва ў музычнай школе, ну і мне за кампанію паскардзілася: «Я сама рызыкнула пафарбавацца толькі ў 17 гадоў, а ў гэтага ўжо не вучоба ў галаве, а модныя трэнды — што з яго вырасце?!».

Я рагатала да слёз, бо мама гэтай самай прыяцелькі -цццаць гадоў таму сказала акурат гэту самую фразу — здаецца, пасля таго як даведалася, што дачка захапілася рэканструктарствам і хоча сплесці з дроту кальчугу... Згадаўшы той выпадак, мы адсмяяліся ўжо разам і прыйшлі да высновы, што дарэмна мама перажывала, харошая вырасла жанчына, жонка, маці, спецыяліст і сяброўка. А сына прыяцелька з мужам хоць і адчыхвосцілі за самадзейнасць, але вяртаць усё назад не прымусілі: няхай самавыяўляецца, калі гэта не перашкаджае вучобе, дый валасы не зубы, адрастуць.

Канфлікт пакаленняў рэч такая ж натуральная і непазбежная, як змена сезонаў, — яшчэ філосафы часоў Сакрата скардзіліся на моладзь, з якой не вырасце нічога добрага. Кола жыцця круціцца год за годам, і тыя, хто калісьці спрачаўся з бацькамі за ўласную самастойнасць, сёння ўжо самі бацькі, і многія шчасліва пераканалі, што раней трава была зелянейшая, а мы — дзеці — разумнейшыя, не параўнаць з цяперашнімі. Ага, ага. Пакуль ёсць магчымасць, распытайце ў дзядуляў і бабуль, якімі былі ў дзяцінстве вашы бацькі — з вялікай доляй імавернасці шмат новага і цікавага даведаецеся. Толькі ўлічвайце, што бацькі могуць зрабіць алаверды і расказаць ужо сваім унукам пра самыя яркія эпізоды з вашага дзяцінства і юнацтва, у якіх экспрэсіўны колер валасоў можа быць найменшай драбязой...

Не, безумоўна, гэта не значыць, што трэба дазволіць дзецям рабіць усё што заўгодна, — ні ў якім выпадку. Калі тыя ж эксперыменты са знешнасцю, модныя захапленні, гульні могуць быць небяспечныя, пра гэта трэба гаварыць, заклікаючы на дапамогу тых, чыё меркаванне для падлетка сапраўды аўтарытэтнае. Але лабавая крытыка ў стылі «я старэйшы, ты дурань», як правіла, бескарысная, а часам выклікае роўна адваротную рэакцыю. Пачуццё густу, стылю і меры, адчуванне адметнасці, а не жадання прыпадабняцца да іншых, — усё гэта варта закладваць і выхоўваць паступова, не заціскаючы дзіця ў жорсткія рамкі і не патрабуючы, каб яно ва ўсім адпавядала чаканням дарослых — вашым, ці сваякоў, ці дырэктара школы.

Напрыканцы прывяду адну з любімых сцэнак пра кантраст паміж чаканнямі і вынікам — са старога фільма «Містар Ікс»:

— А вы былі дзіцёначкам, і такая маленькая-маленькая, ружовенькая-ружовенькая, пухленькая, як парася... І вось гэтае парася расло, расло і вырасла такая вялікая...

— Што вырасла?!

— Ну, што вырасла, то вырасла, цяпер ужо не вернеш.

Гэта я да чаго: важна тое, што ўнутры. І калі там свінячая сутнасць, то якіх ты банцікаў зверху ні накруці, яна рана ці позна раскрыецца на ўсю моц, нібы той свінтус грандыёзус. А калі ўнутры жывы чалавек, добры і цёплы, то хіба важна, будзе ён звонку чорны ці чырвоны?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Каляровы свет

# БІЛЕТ... У ЗАКУЛІССЕ

## Дзе вучыліся спяваць Дзядзька Ваня і Ціма Беларускіх



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Хармайстар Алена САКАЛОЎСКАЯ паўтарае партыю са студыйцамі, якім неўзабаве выходзіць на сцэну.

**Педагогі нярэдка нагадваюць: не выхоўвайце дзяцей, выхоўвайце сябе, бо дзеці ўсё адно будуць падобныя да вас. Вопытныя кіраўнікі гурткоў і секцый могуць дадаць: не рэалізуйце ў дзецях уласныя амбіцыі. Аддавайце сына ці дачку ў спорт, у балет, у музыку не таму, што вам у дзяцінстве карцела стаць другім Марадонам, Плісецкай ці Паганіні, а таму, што дзіця само прагне «сябе паказаць», мае не толькі здольнасці, але і характар, каб не здацца пры першай жа няўдачы. Прынамсі, у дзіцячым тэатры-студыі — гэтая ўнікальная творчая майстэрня існуе пры Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі вось ужо 30 гадоў — пасля кожнага новага набору застаюцца толькі такія вучні.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

# ДАВАЙ НАРАДЖАЦЬ РАЗАМ?

## Чаму роды павінны быць партнёрскімі і з якімі цяжкасцямі сутыкаюцца пары ў раддамах

**Партнёрскія роды ў Беларусі з'явіліся яшчэ ў канцы 90-х, і сёння ім ужо ніхто не здзіўляецца. Але і назваць іх з'явай усеагульнай таксама нельга, нягледзячы на тое што такія магчымасці ёсць не толькі ў сталіцы, але і ў раддамах абласных і іншых гарадоў. Паводле сацыялагічнага даследавання, праведзенага праектам «Радзіны», усяго каля 16 % жанчын нараджаюць з партнёрскай падтрымкай. Прычым за апошнія сем гадоў гэтая лічба змянілася неістотна. З якімі праблемамі сутыкаюцца жанчыны ў радзільных дамах пры арганізацыі партнёрскіх родаў і навошта ім падтрымка мужа, маці, сястры ці доўлы, нам расказалі дзве маладыя матулі, якія нарадзілі сваіх дзетак летась. Сваім меркаваннем з гэтай нагоды падзялілася і акушэр-гінеколаг, якая мае досвед работы ў радзільным доме і выкладання на курсах для будучых мам.**



*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

# Пра сямейны капітал — падрабязна

**Як мы паведамлялі раней, 18 верасня Прэзідэнт падпісаў Указ № 345 «Аб сямейным капітале», які падоўжыў праграму «Сямейны капітал» на 2020—2024 гады. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падрабязна пракаментавала гэты важны для многіх дакумент. З некаторымі яго нюансамі мы знаёмім сёння чытачоў «Сямейнай газеты».**

### *Колькі?*

З 1 студзеня 2020 года сямейны капітал устанаўліваецца ў памеры 22 500 рублёў і прызначаецца пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) у перыяд з 1 студзеня 2020 года па 31 снежня 2024 года трэцяга або наступных дзяцей.

Пачынаючы з 1 студзеня 2021 года памер сямейнага капіталу штогод будзе індэксавацца з нарастаючым вынікам на велічыню індэкса спажывецкіх цэн за папярэдні год для захавання яго пакупніцкай здольнасці.

Новы памер сямейнага капіталу дзейнічае на працягу каляндарнага года (з 1 студзеня да 31 снежня).

За перыяд размяшчэння сродкаў сямейнага капіталу ў банкаўскія ўклады (дэпазіты) «Сямейны капітал» будуць налічацца працэнты ў памеры індэксу спажывецкіх цэн.

Прадстаўленне сямейнага капіталу будзе праводзіцца ў памеры, які дзейнічае на дату нараджэння, у выпадку ўсынаўлення (удачарэння) — на дату ўсынаўлення (удачарэння) трэцяга або наступных дзяцей.

Права на сямейны капітал сям'я можа рэалізаваць толькі адзін раз, гэта значыць калі сям'і прызначаны сямейны капітал па праграме 2015—2019 гадоў, права на прызначэнне сямейнага капіталу ў перыяд 2020—2024 гадоў у яе не будзе.

### *Дзе і як?*

Указам дадзена грамадзянам права на зварот у мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы па прызначэнне сямейнага капіталу не толькі па месцы жыхарства, але і па месцы знаходжання, а па распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу грамадзянам — на выбар грамадзян, альбо па месцы яго прызначэння, альбо ў адпаведнасці з іх рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання).

Таксама ўстаноўлена, што ў выпадку пропуску тэрміну звароту па прызначэнне сямейнага капіталу (на працягу 6 месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга або наступных дзяцей) мясцовы выканаўчы і распарадчы орган мае права аднавіць яго з улікам канкрэтных абставін.

Пры вызначэнні права на распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу (у тым ліку датэрміновае) склад сям'і вызначаецца на дату падачы заявы аб распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу (у тым ліку датэрміновым).

Асобы, якім мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі дадзена права на распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу (у тым ліку датэрміновае), могуць выкарыстоўваць іх у дачыненні да любога члена сям'і, вызначанага ў рашэнні аб распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу (у тым ліку датэрміновым).

### *Важна!*

Для сем'яў, якія маюць права на прызначэнне сямейнага капіталу пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступнага дзіцяці да 31 снежня 2019 года, дзейнічае сямейны капітал у памеры 10 тысяч долараў ЗША, нават калі вы звярнуліся па яго пасля 1 студзеня 2020 года (пакуль не прайшло 6 месяцаў пасля нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга або наступнага дзіцяці).

Пры гэтым парадак прызначэння і распараджэння сродкамі сямейнага капіталу пасля 1 студзеня 2020 года вызначаецца ў адпаведнасці з нормамі Указа па дзвюх праграмах сямейнага капіталу. Такім чынам, права на датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу па дадатковых кірунках пашыраецца таксама на сем'і, сямейны капітал якім прызначаны па праграме 2015—2019 гадоў.

Сямейны практыкум

# ШТРАФ — ЯШЧЭ НЕ САМАЕ СТРАШНАЕ

## Перавозьце сваё дзіця па правілах!

**Дзе лепш ўстанаўліваць аўтакрэсла, у якіх сітуацыях не трэба плаціць штраф за паездку без яго і чаму зімой лепш, калі дзіця ў салоне без курткі? На пытанні маладых мам і татаў на сямейным фестывалі «ТатаPro» адказалі інспектар ДАІ і педыятр.**




***— Калі дзіця можна перавозіць без аўтакрэсла, проста прышпіліўшы рамянём?***

— Згодна з правіламі дарожнага руху, перавозка дзіцяці да 5 гадоў павінна ажыццяўляцца ў адпаведных прыладах, зыходзячы з таго, якія вага і рост дзіцяці, — тлумачыць **інспектар аддзела па агітацыі і прапагандзе ўпраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Раман ЛАШКЕВІЧ.** — Для дзіцяці ад 5 да 12 гадоў — магчыма выкарыстанне бустара (аўтамабільны бустар — гэта дзіцячае ўтрымліваючае прыстасаванне — невялікае сядзенне з падлакотнікамі без спінкі і ўнутраных рамянёў бяспекі. Пры гэтым дзіця прышпільваецца штатным рамянём па аналогіі з дарослым чалавекам). Задача бустара — прыўзняць цела малога, каб штатны рэмень бяспекі праходзіў па грудзях, а не па шыі, што небяспечна для жыцця. Адмова ад бустара дапушчальная і да 12 гадоў, калі рост дзіцяці больш за 150 см. Але дзіця ў абавязковым парадку павінна быць прышпіленае рамянём бяспекі.

Не мае значэння, на якім сядзенні вы перавозіце дзіця — на заднім або пярэднім, пры ўмове, што ў машыне няма падушак бяспекі або можна адключаць іх.

Калі падушкі бяспекі не адключаюцца, перавозіць дзіця ў дзіцячай аўталюльцы альбо аўтакрэсле, устаноўленых спінай да лабавога шкла, дапушчальна толькі на заднім сядзенні. Гэтая забарона тлумачыцца тым, што пры спрацоўванні ў выпадку ДТЗ падушка бяспекі рэзка і з вялікай сілай б'е ў спінку калыскі і прыціскае яе да пасажырскага крэсла, з прычыны чаго дзіця можа атрымаць сур'ёзныя траўмы або нават загінуць.

***— Якія месцы ў аўтамабілі самыя бяспечныя, каб размясціць там аўтакрэсла?***

— Лічыцца, што самае бяспечнае месца — тое, якое размешчана ззаду за кіроўцам. Чаму? У кожнага тут сваё меркаванне, асабіста мая думка такая: у кожнага кіроўцы ёсць інстынкт самазахавання. І ў надзвычайных сітуацыях ён дзейнічае інстынктыўна, адводзячы ад удару свой «бок» машыны, таму ўдар часцей за ўсё прыходзіцца ў бок пасажыра на пярэднім сядзенні. Пасажыр, які знаходзіцца за кіроўцам, нароўні з ім таксама будзе больш абаронены ад небяспекі. Заўважана, што ва ўсіх сур'ёзных ДТЗ смяротны зыход найбольш верагодны для тых, хто сядзіць справа ад кіроўцы альбо ззаду справа, то-бок, за пасажырскім сядзеннем. Пасажыры, якія сядзяць ззаду за кіроўцам, часцей застаюцца жывыя. І, вядома, гэтае правіла дзейнічае пры ўмове, што кіроўца і пасажыры карыстаюцца рамянямі бяспекі.

***— Ці можна перавозіць дзіця без аўтакрэсла, калі едзеш з ім у таксі?***

— Тут дзейнічае выключэнне з правілаў. У таксі дазволена перавозіць дзяцей незалежна ад іх узросту і росту без выкарыстання дзіцячых утрымлівальных прылад. Вядома, гэта небяспечна, таму мы рэкамендуем мець сваё аўтакрэсла і выкарыстоўваць яго ў тым ліку ў таксі.

***— У мяне як у кіроўцы няма свайго аўтакрэсла для дзіцяці, мне яно проста непатрэбнае. Але часам знаёмыя просяць падвезці дзіця, якому менш за 12 гадоў. Што рабіць у такой сітуацыі?***

— Трэба выконваць правілы дарожнага руху. У адпаведнасці з правіламі ўстаноўлены абавязак перавозкі дзіцяці як на заднім, так і на пярэднім сядзенні аўтамабіля ў спецыяльным дзіцячым сядзенні. Штраф, які вам выпіша інспектар ДАІ, будзе ненашмат меншы, чым каштуе дзіцячае аўтакрэсла. А самыя простыя такія прылады для дзяцей каштуюць менш за базавую велічыню — гэта нават танней за штраф. Хоць, калі дзіця трэба тэрмінова адвезці ў бальніцу, а аўтакрэсла няма, за гэта штрафаваць нікога не будуць.



— У доўгай паездцы з маленькім дзіцем, асабліва груднічком, пажадана кожныя 1,5—2 гадзіны спыніцца і рабіць перапынак, — **урач-педыятр Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Анастасія СТРОЦКАЯ:** — Калі дзіця знаходзіцца ў аўтакрэсле-пераносцы ў становішчы напаўлежачы ў 45 градусаў, яго трэба даставаць адтуль праз гэтыя адрэзкі часу, каб яго цельца крыху пабыло ў іншым становішчы.

І яшчэ адзін нюанс: узімку дзіця пажадана перавозіць у аўтамашыне без верхняй вопраткі, таму што калі мы на куртку ці камбінезон надзяваем рэмень бяспекі, ён не стварае надзейнай фіксацыі.

***— Звычайна дзіцяці не падабаецца ехаць у аўтамабілі спінай па ходзе руху, і гэтаму ёсць цалкам зразумелыя прычыны: яму хочацца глядзець на ўсё, што яго акаляе. З якога ўзросту дзіця можна павярнуць тварам па ходзе руху?***

— Перавозіць дзяцей у аўталюльцы або аўтакрэсле трэба заўсёды, выкарыстоўваць дзіцячыя прылады трэба нават тады, калі вы перавозіце нованароджанае дзіця. Ёсць аўтакрэсла-пераноска, якое ўстанаўліваецца, як правіла, супраць ходу руху і выбіраецца альбо па вазе (як правіла, для дзіцяці вагой да 13 кг), альбо па ўзросце (да года). Але, па вопыце, калі дзіця ўжо садзіцца, а гэта адбываецца да года, — яму становіцца цікава, што адбываецца вакол, і яно ўжо не хоча ехаць напаўлежачы. Яно імкнецца сесці, і гэта ўжо не тая бяспека, якую б хацелася мець. У такім выпадку лепш выбіраць аўтакрэслы першай групы, якія прызначаны для дзяцей з 9 месяцаў і да 4 гадоў. Такое крэсла можна ўстанаўліваць ужо па ходзе руху, і дзіцяці будзе ехаць цікава, больш бяспечна і камфортна.

**Запісала Святлана БУСЬКО.**

Напярэдадні

# ДЗЕ ЖЫВЕ «СЯМ'Я ГОДА»?

**Чацвёрты рэспубліканскі конкурс «Сям'я года» фінішуе ў сталіцы 12 кастрычніка. Удзел у вялікай праграме, што пройдзе ў Палацы прафсаюзаў, возьмуць пераможцы абласных і Мінскага гарадскога этапаў спаборніцтва — сем прыгожых, моцных, творчых, спартыўных і сацыяльна актыўных сем'яў.**

У кожнай з іх падрастаюць сама меней трое дзяцей, прычым у Мікалая і Надзеі Нікіціных з Гомеля — дзве пары блізнят, хлопцы і дзяўчаты, а ў прадстаўнікоў сталіцы Вольгі і Дзмітрыя Бычкоўскіх — дзяцей ажно восем, і ў старэйшага сына ўжо ў самога ёсць сям'я...

У фінале конкурсу «Сям'я года» ўсе сямёра ўдзельнікаў прадставяць на суд журы два заданні: візітоўку «Радавод» (гісторыя свайго роду і сямейныя традыцыі), а таксама ўласны сацыяльна значны праект «Мая краіна — мая сям'я», дзе раскажуць пра сваю актыўную жыццёвую пазіцыю, захапленні, поспехі і планы. Пераможцы, якія атрымаюць ад журы найбольшую колькасць балаў, будуць адзначаны дыпломамі І, ІІ і ІІІ ступені, а таксама грашовымі прэміямі: так, уладальнікі звання «Сям'я года — 2019» атрымаюць паводле конкурснага палажэння грашовы прыз у памеры да 75 базавых велічынь, разам з двума дыпломамі ІІ ступені будуць уручаны сертыфікаты да 35 базавых велічынь, а кожны з чатырох дыпломаў ІІІ ступені прынясе сваім гаспадарам да 20 базавых велічынь. Такім чынам арганізатары конкурсу — Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — не абыдуць увагай нікога з лаўрэатаў. Прадугледжаны таксама прызы, дыпломы, спецыяльныя ўзнагароды і ад іншых арганізацый і ведамстваў, якія падтрымліваюць праект.

Нагадаем, першы рэспубліканскі конкурс «Сям'я года» адбыўся ў нашай краіне ў 2012 годзе, і яго пераможцамі стала шматдзетная (пяцёра дзяцей) сям'я Глазковых з Магілёва. Праз два гады трыумф святкавала сям'я Ніканчук (трое дзяцей) з Наваполацка, а ў 2017 годзе на першую прыступку ўзняліся бацькі і шасцёра дзяцей сям'і Петрушко з Калінкавічаў Гомельскай вобласці. Цікава, прадстаўнікам якога рэгіёна пашанцуе стаць найлепшай беларускай сям'ёй сёлета? У наступным выпуску мы раскажам больш падрабязна пра ўсіх фіналістаў, а пакуль што нагадаем балельшчыкам: хварэць за сваіх — можна і трэба, таму прыходзьце 12 кастрычніка ў рэспубліканскі Палац прафсаюзаў з плакатамі, кветкамі і добрым настроем!

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# ДАВАЙ НАРАДЖАЦЬ РАЗАМ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Паводле апытання, праведзенага праектам «Радзіны» два гады таму, з 2012 да 2017 года ў Беларусі было ўсяго 16,3 % партнёрскіх родаў. Пры гэтым больш за 71 % жанчын хацелі б нараджаць з падтрымкай і выбраць партнёра для родаў. Такая ж лічба партнёрскіх родаў (16 %) была названа і падчас анлайн-апытання жанчын, якія нарадзілі ў 2017—2019 гадах. Яго вясной гэтага года для ініцыятывы «Тваё права на пазітыўны досвед у родах» правёў праект «Радзіны». Таму можна меркаваць, што колькасць партнёрскіх родаў расце вельмі марудна. Хоць медыкі запэўніваюць, што з году ў год іх становіцца больш. Напрыклад, у радзільным доме пры 5-й клінічнай бальніцы Мінска летась з 5565 родаў каля 500 былі партнёрскімі, а сёлета гэта лічба будзе большай.

**«З'яўленне таты на родах — гэта асабістае жаданне мужчыны. Ні ў якім разе жанчына не павінна настойваць на тым, каб яе муж прысутнічаў на родах, маўляў, цяпер усе так нараджаюць».**

Паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя для фарміравання станоўчага вопыту родаў і забеспячэння здароўя маці і дзіцяці прадугледжваецца пастаянная партнёрская падтрымка. Прысутнасць партнёра на родах рэкамендуецца абсалютна для ўсіх жанчын. Сярод цяжкасцяў пры арганізацыі партнёрскіх родаў беларускі называлі адсутнасць месцаў і індывідуальных палат у радзільным доме, праблемы з боку персаналу і цяжкасці бюракратычнага характару.

## «З пачуццём абароненасці і спакою»

У маці траіх дзяцей мінчанкі Ганны Малышавай толькі адны роды былі партнёрскімі.

— Падчас першых двух родаў я, напэўна, была не так добра інфармавана і падрыхтавана, таму проста выконвала ўсё, што казалі ўрачы. У першых родах мне далі таблетку пад язык для паскарэння раскрыцця. У другіх — пракалолі каляплодны пузыр. Трэці раз я саспела несці адказнасць за свае роды і загадзя сама пачала вывучаць інфармацыю, што лепш для мяне і майго дзіцяці.

Партнёрам Ганны на родах быў муж.

— Ён быў проста побач: прывёз мяне ў радзільны дом, запаўняў паперкі. Падчас саміх родаў я папрасіла яго выйсці, а потым ён адразу вярнуўся і перарэзаў пупавіну, калі яна адпульсавала. Потым назіраў, як дзіця ўзважылі, завярнулі, і ўзяў яго на рукі. Так мы правялі ў палаце разам тры гадзіны. Прысутнасць мужа давала мне найперш пачуццё абароненасці і спакою. Калі старэйшых дзяцей я нараджала адна, адчувала сябе няўпэўненай і слабай.

Ганна выбрала радзільны дом пры 5-й клінічнай бальніцы Мінска, бо толькі там без пярэчанняў успрынялі ўсе пажаданні маладой матулі. Сярод іх, у прыватнасці, вертыкальныя роды без «паскаральных» працэдур, адтэрмінаванае перарэзанне пупавіны і прыкладанне да грудзей.

— Праўда, на саміх родах на некаторыя свае «нестандартныя» просьбы я атрымлівала мяккую адмову. Напрыклад, я папрасіла выконваць КТГ (электронны маніторынг сэрцабіцця плода. — **«Зв.»**) на фітболе — мне мякка сказалі, што так рабіць нельга. У выніку мы ўсё ж дамовіліся, і яго вымяралі на фітболе. Усё атрымалася так, як мы і хацелі: ніякіх лішніх маніпуляцый мне не прапаноўвалі, але ўсё і так прайшло хутка. Я карысталася прыёмамі для аблягчэння болю падчас схватак, пра якія нам казалі на курсах. Вертыкальныя роды сапраўды аказаліся лягчэйшыя. Медперсанал быў ветлівы да родаў і пасля. Усе ішлі насустрач і сапраўды адчувалася, што медыкі стараюцца штосьці змяніць у лепшы бок. Але паколькі практыкі яшчэ недастаткова, то калі не папросіш, будуць дзейнічаць як ім прасцей і зручней. Няма попыту, няма і прапановы, — лічыць Ганна Малышава.

Яна ўпэўнена, што чым больш будзе «асэнсаваных» парадзіх, тым хутчэй зменіцца сістэма родадапамогі. І лічыць, што базавую інфармацыю дзяўчаты павінны атрымліваць калі не ў школе, то хоць ва ўніверсітэце.

— Косінусы і сінусы вучаць усе, а прымяняюць адзінкі, у адрозненне ад родаў.

Пры гэтым, нягледзячы на тое, што досведам партнёрскіх родаў Ганна збольшага задаволеная, не абышлося без дробязяў, якія падсапсавалі ўражанне.

— Дзіця адразу палажылі мне на жывот з неперарэзанай пупавінай, як я і прасіла. Паклікалі мужа, каб ён перарэзаў пупавіну адразу, як яна адпульсуе. А праз тры гадзіны дзіця забралі. Прынеслі толькі праз чатыры гадзіны — накормленае сумессю. Лічу, што гэта проста недапушчальна ў XXI стагоддзі! На сённяшні б, канешне, адмовілася аддаваць дзіця нават на пяць хвілін, тым больш што адчувала я сябе добра і роды прайшлі без ускладненняў. Але пасля бойкі кулакамі не махаюць.

## «Людзі гатовы плаціць, але не хапае палат»

Для мінчанкі Надзеі Кім роды былі першыя. Нараджала яна таксама ў 5-й клінічнай бальніцы, а побач, як і ў Ганны, быў муж.

— Ён бегаў у машыну па забытыя дакументы, у перадродавай палаце клікаў медсястру, калі мне патрэбна была дапамога. Мне значна спакайней было ведаць, што ёсць чалавек, які сходзіць кудысьці, пакліча, патлумачыць, і да яго не ставяцца як да неадэкватнага. Для мяне было важна, што мы разам маглі памаліцца, бо мы веруючыя. Мой муж абсалютна спакойна рэагаваў на ўсё. Але, можа, таму, што ўсё ішло добра і я сама не панікавала, не было эмацыянальнай напружанасці.

Пры мужу, кажа Надзея, ніхто не хаміў, а вось калі ён адлучаўся, і ў прыёмным пакоі, і пасля родаў давялося выслухаць ад персаналу пару не самых прыемных рэплік:

— Пасля родаў доктар сказала, што я прыкідваюся, нібы мне кепска, на што муж, пакуль я хадзіла на працэдуры, патлумачыў, што ніхто не прыкідваецца, і размовы адразу сталі больш лагодныя.

Сутыкнулася сямейная пара і з недахопам палат.

— Перад родамі мы дамаўляліся на палату сямейнага тыпу, але яна вызвалілася толькі праз суткі. Паколькі я адчувала сябе вельмі дрэнна, малы гэты час правёў на посце медсястры. Калі б муж быў побач, ён бы мог за ім прыглядаць. Было б добра, калі б у раддамах маглі ўладкаваць большую колькасць палат — сямейных і для партнёрскіх родаў. Бо людзі гатовы плаціць, проста не хапае палат.

Былі і іншыя дробязі, якія маладая матуля хацела б змяніць:

— Нічога асаблівага не забаранялі, але падыход падчас родаў быў такі: «Навошта вам даўжэй пакутаваць», таму недзе пасярэдзіне працэсу паставілі аксітацын. Цяпер я разумею, што можна было і без яго. У нас гэта першае дзіця, і, нягледзячы на тое, што мы былі на курсах, усё адно мы многае не разумелі. Цяпер я ўжо некаторыя рэчы папрасіла б не рабіць і сказала б мужу за гэтым прасачыць, бо і нараджаць, і кантраляваць усё астатняе складана. Я б параіла будучым матулям пісаць «план родаў» і дэталёва яго абмяркоўваць з мужам, каб ён ведаў, на што звяртаць увагу. Ну і зразумела, я за партнёрскія роды. Мне складана ўявіць, як іншыя нараджаюць адны. Гэта гераізм, як па мне.

**«З другога боку, уразлівы партнёр, які хвалюецца больш, чым сама жанчына, — не памочнік, а толькі абуза як для парадзіхі, так і для персаналу. Таму пры выбары трэба аб'ектыўна ацэньваць свайго памочніка».**

## «Аб'ектыўна ацэньвайце свайго памочніка»

Сёння менавіта за партнёрскія роды выступаюць і многія медыкі.

— Ужо абсалютна дакладна даказана навуковымі даследаваннямі, праведзенымі як у краінах СНД, так і на Захадзе, што пры партнёрскіх родах зніжаецца частата акушэрскіх умяшанняў, радавога траўматызму, прымянення антыбактэрыяльнай тэрапіі ў пасляродавым перыядзе як у маці, так і ў нованароджанага, паляпшаюцца перынатальныя і мацярынскія зыходы ў цэлым. Таму я за партнёрства ў родах, — кажа **ўрач акушэр-гінеколаг, кандыдат медыцынскіх навук Кацярына ШЫЛКІНА.** — На мой погляд, якімі павінны быць роды, вырашае сама будучая матуля і яе сям'я. Галоўнае, каб у кожнай жанчыны была магчымасць бачыць на родах таго чалавека, з якім ёй будзе спакойна, камфортна, з якім яна будзе адчуваць сябе ў бяспецы.

Большая частка жанчын, якія адважыліся на партнёрскія роды, нараджаюць разам з мужам. Але партнёрам можа быць і сястра, матуля ці іншая сваячка, а таксама доўла.

— Аднак ёсць і тыя жанчыны, якім партнёр у родах не патрэбны, яны выдатна справяцца з родамі самастойна толькі з адной акушэркай, — адзначае Кацярына Шылкіна.

Пры гэтым урач звяртае ўвагу, што падрыхтаваны партнёр сапраўды дапамагае жанчыне. А вось уразлівы чалавек хутчэй нашкодзіць, таму, выбіраючы блізкага чалавека, які пойдзе з вамі на роды, важна не памыліцца:

— Няма сумненняў, што чалавек, які прыйшоў з жанчынай на роды, павінен быць падрыхтаваны і дасведчаны ў тэме родаў, гэта не чалавек з вуліцы, калі мы маем на ўвазе паўнавартаснага партнёра, які знаходзіцца ў пакоі з парадзіхай. Партнёр можа падтрымаць, падбадзёрыць, расказаць вясёлую гісторыю, проста памаўчаць побач, сагрэць, пашкадаваць. З другога боку, уразлівы партнёр, які хвалюецца больш, чым сама жанчына, — не памочнік, а толькі абуза як для парадзіхі, так і для персаналу. Таму пры выбары трэба аб'ектыўна ацэньваць свайго памочніка, — раіць Кацярына Шылкіна.

Пры гэтым абавязкова павінна быць жаданне партнёра прысутнічаць на родах.

— З'яўленне таты на родах — гэта асабістае жаданне мужчыны. Ні ў якім разе жанчына не павінна настойваць на тым, каб яе муж прысутнічаў на родах, маўляў, цяпер усе так нараджаюць. Калі мужчына не хоча ісці, не варта яго прымушаць. У маёй практыцы падрыхтоўкі пар да партнёрскіх родаў было нямала выпадкаў, калі таты наведвалі ўсе дзевяць заняткаў ад званка да званка, вялі канспекты, але абсалютна дакладна ведалі, што на роды не пойдуць. Затое яны былі знаёмы з усімі нюансамі цяжарнасці, асаблівасцямі родаў, ведалі, калі адвезці жонку ў раддом, як дапамагчы ёй псіхалагічна, як падрыхтавацца да сустрэчы з раддому, нюансы груднога кармлення і практычнай дапамогі. Такія таты былі на сто працэнтаў тэарэтычна падрыхтаваны. І іх рашэнне я цалкам разумею і паважаю. Усе мы розныя, — расказвае Кацярына Шылкіна. — Іншыя таты прысутнічаюць на родах увесь першы перыяд, але ў момант з'яўлення малога на свет застаюцца ў перадродавай палаце і ў радзалу не ідуць. Гэта таксама іх выбар ці, магчыма, выбар мамы.

Урач раіць маладым татам падрыхтавацца да родаў грунтоўна: прайсці курсы ў спецыялістаў, пачытаць праверанаю сучасную літаратуру, сумленна адказаць сабе на пытанне, ці хочуць і ці змогуць дапамагчы сваёй жанчыне ў нярoсты момант. І любы адказ будзе правільны, бо ён — ваш.

**Алена КРАВЕЦ.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Бацькі і дзеці

# КАЛІ ЖЫЦЦЁ — ГУЛЬНЯ,

## або Самае складанае мастацтва — мастацтва жыць

**...Гасцініцу ў тым горадзе ахоўвалі два сімпатычныя сабакі. Звалі іх Ружа і Бязмен.**
**— Дзіўныя мянушкі, — засмяяліся мы.**
**Наша праважатая не згадзілася:**
**— Бачыце, колькі дамоў, — уздыхнула яна. — Уяўляеце, колькі кватэр? І амаль у кожнай — што ні ружа, тое бязмен.**
**Казала пра гэта адна з найстарэйшых і найлепшых гінеколагаў горада, і не верыць ёй, вядома ж, не выпадала. Да таго ж на зямлю апускаўся вечар, людзі вярталіся з работы — у вокнах кватэр запальвалі святло.**
**Тры акны на трэцім паверсе заставаліся чорнымі.**

...ЯШЧЭ ўчора, здаецца, там жыла сям'я, як сям'я (прынамсі, знешне): дарослыя зранку спяшаліся на работу, малы — у школу. Першым ён вяртаўся і дамоў, нешта браў «пажаваць», садзіўся за ўрокі. Потым прыбягала маці, заступала на кухню грэць-гатаваць, і яны вячэралі. Бацьку даўно не чакалі. Ён, як сказаў, «зарабляе грошы мазгамі», а таму па вечарах мае права недзе пасядзець, выпіць (як мінімум піва), пагуляць... Не, на шчасце і як быццам не з дзеўкамі: да 11—12 вечара ён мог прасядзець за камп'ютарам, гуляючы ў «танкі» ці нешта яшчэ.

— Ты б хоць зрэдку парой прыходзіў дадому, — ноч-апоўнач збіраючы на стол, уздыхала Паліна. — Можа, дапамог бы што, разам павячэралі б, пагаварылі... І ў выхадныя, добра было б пад'ехаць на дачу. Ганак зусім разваліўся...

Слухаць гэтую «пласцінку» Віталік «цярпець ненавідзеў». Казаў, што яму без розніцы, што есці і ў чыёй кампаніі, пытаў, аб чым яму размаўляць з васьмігадовым дзіцем, даводзіў, што выхадныя для таго і даюцца, каб чалавек адпачыў, а не гарбаціўся ў цешчы на дачы...

І дома (як тая цешча казала) ён ніткі не рваў: жонка забылася напамінаць, што ў пакоях даўно пара памяняць шпалеры, што ў кухні «распаўзаецца» мэбля, што ў лоджыі — самае месца для закатак, але няма ніякіх паліц... Ды што там — у прыбіральні адарвалася неяк зашчапка. Мужу часу не было прыкруціць. А Паліна, паспрабаваўшы, толькі «раскалупала» дзверы...

Пасля гэтага разоў колькі наўмысна «рвалася» ў той закутак следам за мужам — можна сказаць, заспявала на ўнітазе. Толькі пасля гэтага ён узяў у рукі адвёртку...

Як можна «падбіць» гаспадара на іншыя «подзвігі», Паліна не ведала: працуючы і ў адзіночку гадуючы сына, у многім дапамагаючы сваёй маці і свекрыві, яна, здаецца, змірылася з «фіктыўнасцю» шлюбу. Ведала, што на добры толк яго даўно пара скасаваць... Але ж на свае вочы бачыла, як цяжка (і дзецьмі найперш) перажываюцца разводы-раз'езды ў іншых сем'ях, і таму ніяк не рашалася. Да таго ж — хто б яе зразумеў: муж не п'е, не б'е, грошы зарабляе...

ЗА тыя, што яна адклала на рамонт — хоць бы ў адным пакоі (муж сказаў, што сёлета зрабіць у яго зноў не атрымаецца), — Паліна вырашыла звазіць малога на мора — сесці з ім у цягнік ці ў самалёт, праехаць альбо праляцець над зямлёй і апынуцца...

Разам з сынам яны доўга марылі — выбіралі месца, пракладвалі маршрут, збіралі рэчы і ўсё...

Ім пашчасціла з самага пачатку — з гасцініцай, з надвор'ем. Шторанічкі яны спяшаліся на пляж, купаліся ў цёплай марской вадзе, валяліся на чыстым гарачым пяску, хадзілі па вуліцах старажытнага мястэчка, зазіраючы пры гэтым то ў храм, то ў музей, то ў парк, ездзілі на экскурсіі... А нарэшце, стаміўшыся, доўга-доўга вячэралі на адкрытай верандзе — успаміналі, перабіралі ўсе ўражанні, усе справы пражытага дня...

І стравы, дарэчы, таксама, бо ў іх рэстаране з так званым шведскім сталом было столькі ўсяго ні разу не каштаванага, што малы нават «графік» склаў, што выбраць заўтра, а што паслязаўтра...

Хіба праз тыдзень ён здаволіўся: сказаў, што зойме столік, а з'есць — ну проста ўсё...

Маці — хлопчык сачыў — нешта выбірала, да яго стала з поўным падносам, а тым часам кіраваў нейкі дзядзька.

— Пан не будзе супраць, калі я тут сяду? — папытаўся ён.

І па-беларуску, як быццам, але ж Рома не ведаў, што адказаць. Добра — з'явілася маці.

— Нех пані дазволіць мне павячэраць, — не тое паставіў перад фактам, не тое папрасіўся гэты «нярускі».

Паліна акінула позіркам залу (у ёй сапраўды неяк зашмат народу) і, сцепануўшы плячом, згадзілася.

Паляка звалі Яцэк. Яго продкі па лініі маці былі з-пад Гродна, і ён так смешна размаўляў па-беларуску...

Ромік — малы — яго папраўляў, вучыў, як трэба.

А назаўтра ўжо Яцэк адшукаў іх на пляжы і падрадзіўся «паквітацца» — павучыць Рому плаваць.

— Марна... Мы сем дзён на гэта патрацілі, — уздыхнула Паліна. — Два метры па-сабачы... Больш — не атрымалася.

— Дык то ж у вас, — смяяўся новы знаёмец. — А вось у нас...

Яны, двое — дарослы і малы — па чарзе, адзін перад адным, перабіралі рукамі-нагамі, кідалі гэты занятак, проста дурэлі на мелкаводдзі, потым зноў пачыналі «ўрок», а Паліна, гледзячы на іх, думала... Думала пра мужа, пра мужчын. Ну чаму, напрыклад, роднаму бацьку нецікава размаўляць са сваім сынком, нечаму навучыць яго, некуды схадзіць ці з'ездзіць (а хоць бы і цяпер, на мора), а вось гэты, чужы, ну як прыкіпеў!.. Не, не да яе (бо яна б умомант адшыла!), а да дзіцяці: з такой цікавасцю слухае, з такой павагай гаворыць...

Пакуль падумала, сын... паплыў: закрычаў ад радасці, потым яе ж спалохаўся і «пайшоў» на дно, але побач быў Яцэк...

Яны зноў вячэралі ўтраіх.

І назаўтра снедалі, купаліся, ездзілі на экскурсію. «Хлопцы» тады крыху адсталі ад групы — затрымаліся ля свежых раскопак. Гід гукнуў:

*— Э-э, папаша с ребёнком! Не отставайте!*

І Яцэк (Паліна ўбачыла) нібы зачапіўся за нешта — спатыкнуўся, выпусціў руку малога, пабітым сабакам глянуў на маці, і было ў гэтым позірку нешта такое...

ІХ водпуск канчаўся, ім пара было ад'язджаць — Яцэк праводзіў, пасадзіў на самалёт, папрасіў дазволу напісаць, высылаць фатаграфіі — сыну.

Маці не пярэчыла.

І пасля водпуску не сварылася больш на Рому, што сядзіць за планшэтам, бо цяпер яна ведала, што гэта не ў пустых «стралялках-даганялках», а яшчэ і ў шчырых сяброўскіх зносінах з добрым разумным чалавекам, які Роме быў вельмі патрэбны... Ды і Яцэку, здаецца, таксама.

З часам Паліна дазналася, што жыве ён адзін у вялікім доме бліз Кракава, што ў яго свой бізнес, што разоў колькі на год ён бывае ў Беларусі.

Не сказаць, каб яна чакала яго прыезду, але ж думала, што гэта некалі здарыцца...

І сапраўды — ён прыехаў. Патэлефанаваў у суботу раніцай і менавіта ёй (чаго ніколі не было), сказаў, што вельмі хацеў бы ўбачыцца, павіншаваць Рому з мінулым днём нараджэння. І яны, ужо «прыбраўшыся» і сабраўшыся ехаць на лецішча, выклікалі таксі — з сынам панесліся на вакзал, потым — і ўсе разам — махнулі ў заапарк, у Батанічны сад, дзе спачатку была кафэ і дзе іх ужо чакаў па-святочнаму накрыты стол.

— Я віншаваў цябе з днём народзінаў, — сказаў імянінніку Яцэк. — Але гэта на словах. Сёння — час падарункаў. І я шмат чаго накупляў, але і на жаль, не маю права аддаць... Таму я прыехаў, каб сказаць табе, што вы з мамай — вельмі дарагія мне людзі... Нават самыя дарагія... Дарагія настолькі, што я вельмі хацеў бы дарыць вам святы — сёння і кожны дзень... Калі вы дазволіце...

Яцэк запытальна глядзеў на Паліну. Малы — таксама: «Ну скажы яму «так»!» — моўчкі ўмольваў ён.

І маці хацела, можа, нават сказала — шчасцем, якім засвяціліся вочы, удзячнай усмешкай, міжвольным рухам рукі...

Да слоў пакуль не дайшло.

Хіба да ўчынкаў?

...ПАСЛЯ водпуску яна не ўставала больш апоўначы, каб мужу падаць вячэру, раніцой на спінку крэсла не вешала яму свежую сарочку, перастала пра нешта пытаца: прыйшоў — добра, пайшоў — таксама.

Муж, як ні дзіўна, гэта заўважыў, хоць і не хутка. Аднойчы нават сказаў, што прыедзе — забярэ іх з лецішча і такі паправіць там ганак.

Работы было — на пару гадзін, а ўжо ж потым гонару...

Цешча любімы пірог спякла, пляшку паставіла.

Ён чакаў, што і жонка, як некалі, вечарам пасля лазні (Віталь яе не любіў) з гарбатай і прысмакамі падымецца ў яго пакой на гарышчы, але...

Не паднялася.

Тады (чаго ніколі не было — нават з нагоды!) ён узяў і купіў ёй кветкі.

І з работы стаў адразу прыязджаць дамоў. І пірожныя неяк купляў. І спрабаваў сваіх разгаварыць. Але гэта ў яго чамусьці не атрымалася: сын спяшаўся да сябе, жонка — то да хатніх спраў, а то...

Яна — ці бачыце — дзяцінства ўспомніла, села... маляваць. І было б там што (Віталь бачыў): на ўсіх карцінках — мора і людзі на беразе. Недзе — двое — быццам Ён і Яна, а недзе ўжо трое (яшчэ і дзіця)... Ці малых ужо шмат.

Паліна (ён ведаў гэта) хацела другое дзіця, альбо нават дваіх... Ён — пяць гадоў, пакуль не было кватэры, машыны, прыстойнага рамонту — не хацеў і першага...

Але ж — калі на тое пайшло — то няхай! Аднойчы, сабраўшыся з думкамі, ён так і сказаў, што яго, маўляў, справа, маленькая... Што ён («ну, халера з ім»!) згодны «ўтрымліваць» і яе, і дзяцей, але не больш...

— А ўжо не трэба — ні больш, ні менш, — спакойна ўсміхнулася жонка. — Мы разводзімся, сын застаецца са мной.

— Дзе застаецца? — як за саломіну ўхапіўся муж. — Гэта мая жылплошча!.. І грошай я вам не дам!

— Кватэра нам не патрэбна, грошы, здаецца, таксама... Жыві, як знаеш. Як хочаш...

ВІТАЛЬ — і толькі цяпер, здаецца — ведаў, ЯК. Да смешнага проста! Прачнуўшыся, «адным носам», ён хацеў бы згадваць, што ў іх на сняданак, накідваць на плечы свежую кашулю, абдымаць любімую (!) Паліну, за руку вітацца з малым і казаць яму, напрыклад, што сёння вечарам яны ўсёй сям'ёй...

Дагэтуль ён (і разумны ж, як быццам: вунь колькі разоў выйграваў у «дурнога» камп'ютара!) ніколі не думаў, што побач столькі месцаў, куды можна схадзіць з дзіцем і жонкай... Ён забыўся, калі быў у кіно і ў лесе, у спартзале, на нейкім канцэрце ці выстаўцы. Ён толькі чуў пра аграсядзібы і паездкі ў іншыя гарады і краіны. Ды што там — да роднай маці ён завітваў на Каляды і 8-га Сакавіка!.. А недзе ж там, у гаражы, гадамі ржавелі яго канькі і ровар (жонка з сынам на сваіх каталіся), недзе там заставаліся яго кніжкі і альбомы з маркамі. Іх цікава было б паказаць сыну. І нават перавезці — купіць што з мэблі... А то і ўсю...

Паліна мела рацыю: трэба было (і даўно) зрабіць нацяжныя столі, пакleiць шпалеры (жонка яшчэ па залетась купіла і неяк прывалакла), памяняць гнілыя вокны.

І мэбля ў іх сапраўды старая, прычым — немаведама, чыя: засталася ад мінулых жыльцоў. Ён тады сказаў Паліне, што гэта на час, пакуль даўгі аддадуць, пакуль нейкія грошы зарабяць.

Ну, зарабілі... Ён (вядома ж, болей за жонку)... І што? Каб усё зла*жыць*»? Ці — каб *жыць?..*

ЯК, — цяпер ён ведаў і хацеў: парываўся сказаць Паліне... Хоць і разумеў, што гэта ўжо марна. Яго жонка ніколі не прымала паспешлівых рашэнняў: кожнае — а тым болей важнае — доўга абдумвала, каб потым не перадумваць — не вяртацца назад.

**...На горад, на гасцінічны двор (пад аховай Ружы і Бязмена) даўно апусціўся вечар, людзі, вярнуўшыся з работы, запалілі святло.**

**Тры акны на трэцім паверсе заставаліся чорнымі.**

**Валянціна ДОЎНАР.**



# БІЛЕТ... У ЗАКУЛІССЕ



«Спектакль, які глядзіш з-за куліс і ў зале, — дзве зусім розныя рэчы», — прызнаецца кіраўнік дзіцячага тэатра-студыі Алена НЯРОНСКАЯ.

**Пра ўзроставыя адметнасці, цяжкасці работы з бацькамі і перспектывы выхаванцаў «СГ» гутарыць з кіраўніком студыі Аленай НЯРОНСКАЙ.**

***— Кажуць, сёлета ў вас нейкі асабліва вялікі набор?***

— Ён заўжды вялікі, дзяцей кожны год прыходзіць вельмі многа. Вось, глядзіце: на пачатку верасня на праслухоўванне было запісана 54 дзіцяці, і звычайна яшчэ каля дваццаці чалавек прыходзіць без запісу, проста ў апошні момант — не адмаўляць жа ім. Набралі мы ў студыю 35, і, шчыра скажу, дазвалялі сабе выбіраць, шукаць найлепшых сярод выдатных, бо прыйшлі насамрэч вельмі падрыхтаваныя дзеці. (У студыю прымаюцца дзеці ад 7—8 гадоў, з пачатковай музычнай адукацыяй — як мінімум з веданнем нотнай граматы, артыстычныя і пластычныя. — **Аўт.**) Тут удакладню: справа не ў тым, што ёсць дзеці дрэнныя, а ёсць добрыя. Проста далёка не кожнае дзіця нават перад самай прыязнай камісіяй (у нашу, напрыклад, уваходзяць народная артыстка Беларусі Ніна Шарубіна, загадчык опернай трупы тэатра, заслужаная артыстка Ніна Казлова, хормайстар Сяргей Аграновіч — усе вельмі вопытныя і дружалюбныя да дзяцей) можа раскрыцца і паказаць сябе як след. Я сама маці і ведаю, што са мной сын адзін, у калектыве ці на конкурсе — зусім іншы, і як ён будзе сябе паводзіць, прадказаць цяжка. Аднак сёлета набор быў сапраўды моцны, і зусім невялікая колькасць дзяцей узятая на выпрабавальны тэрмін у залежнасці ад таго, як пакажуць сябе, — усе астатнія залічаны ў студыю. І цяпер мы з імі з радасцю і хваляваннем рыхтуемся да «Стварэння свету» — гэта балет, які ідзе ў суправаджэнні дзіцячага хору, што атрымліваецца вельмі прыгожа і зусім інакш, чым з «дарослымі» галасамі. Натуральна, пераважна прыходзяць дзяўчаткі, бо хлопчыкаў, як заведзена, часцей аддаюць у спорт, а не ў класічны вакал.



Спыніся, імгненне!
І паўтарыся яшчэ раз.

Можна не ведаць нот, але займацца ў студыі і хадзіць сюды хоць да пенсіі. Але многія бацькі лічаць як: аддалі дзіця ў студыю, значыць, праз месяц яно ўжо мусіць выйсці на сцэну тэатра. А чаму яно павінна там быць і паказваць гледачу вельмі сярэдні ўзровень? З гэтым заўжды даводзіцца не тое каб змагацца, але бясконца тлумачыць бацькам, што артыст музычнага тэатра — вялікая праца, і каб здаць партыю, яе трэба вучыць, шмат разоў паўтараць і ўдасканальваць... Бацькі хочуць бачыць вельмі хуткі вынік. А дзецям у сем-восем гадоў, па вялікім рахунку, усё адно, на якой сцэне стаяць — Вялікага тэатра ці Палаца культуры, галоўнае, што ёсць публіка, і што яны такія прыгожыя выступаюць перад гледачамі і атрымліваюць апладысменты.

З 35 чалавек навічкоў да Новага года, зыходзячы з вопыту, у найлепшым выпадку застанецца дваццаць, а да канца сезона, можа, толькі пятнаццаць тых, хто гатовы некалькі разоў на тыдзень ездзіць на заняткі без агляд-кі на халоднае надвор'е, недахоп часу, доўгую дарогу і дні нараджэння сваякоў і суседзяў.

— Вельмі часта даводзіцца бачыць, як бацькі рэалізуюць у дзецях свае ўласныя, некалі няспраўджаныя дзіцячыя мары. Паўтаруся, я сама мама, і мой сын упершыню трапіў у тэатр у шасцімесячным узросце, у дзевяць месяцаў мы ўжо стаялі за кулісамі навагодняга канцэрта, у чатыры гадкі ён іграў ролю слугі Людаеда ў мюзікле «Кот у ботах». Спачатку мне страшна хацелася, каб сын займаўся картынгам і суднамадэляваннем, потым — каб працягнуў творчую дынастыю, тым больш у яго вельмі неблагі барытон... Балазе сын аказаўся з мазгамі і характарам, чаго ён не хацеў рабіць, прымусіць было немагчыма, і ў выніку ён сказаў, што не бачыць сябе ў мастацтве ад слова «наогул», і паступіў на юрыдычны факультэт. І хоць там ён усё адно запісаўся ў КВЗ і нейкія творчыя гурткі, і гэта ўжо яго ўласны выбар. Але тут чалавеку 17 гадоў і ён можа заявіць пра сваю пазіцыю. А калі дзіцяці сем, і мама спіць і бачыць яго на вялікай сцэне — гэтае няшчаснае дзіця марыць зусім пра іншыя рэчы, але вымушана рабіць тое, што сказала мама...

***— Ніжні ўзроставы парог студыйцаў — 7-8 гадоў. Раней не варта ісці ў тэатр?***

— Глядзець пастаноўкі, у тым ліку знаёміць дзіця з операй і балетам — варта і трэба, гэта тыя ўражанні, якія застануцца з чалавекам назаўжды і спрыяюць культурнаму выхаванню асобы. Што да заняткаў, тут справа іншая. Я некалі працавала ў школе настаўніцай пачатковых класаў і спеваў — і на ўласным вопыце пераканалася, што ў шасцігадовых дзяцей свой, асобны цыкл адукацыйнага працэсу: максімум 35 хвілін заняткаў, з якіх абавязкова дзве «фізхвілінкі», і бясконцая змена дзейнасці. Вывучыць за 35 хвілін з двума перапынкамі харавую партыю балета «Стварэнне свету» проста немагчыма. Зразумела, бываюць выключэнні, але іх можна пералічыць па пальцах. Збольшага малодшым дзецям проста надакучваюць доўгія заняткі, і малое — раз, і залезла пад раяль, яму там добра, і што я тут зраблю, не пакідаць жа сто чалавек хору і не лезці пад раяль выцягваць гэта дзіця. Для старэйшых дзяцей дысцыпліна — не пустое слова, з імі можна дамовіцца, і ў нас асабліва не пасваволіш.



Усе — у вобразе.

***— Ці можна вызначыць па некалькіх рэпетыцыях, у каго ёсць перспектыва, а хто проста добра бавіць час?***

— На мой погляд, адразу гэта вызначыць немагчыма. Скажам, прыйшоў да нас хлопчык, яму 12, вельмі артыстычны, ноты ведае — але чутна, што ўжо ідзе мутацыя, таму голас трэба пакуль што пабярагчы, будзе выступаць у міманс. Менш за месяц прайшло, як некалькі хлопчыкаў з новага набору ўжо ўдзельнічалі ў спектаклі «Князь Ігар» — такія яны жывыя, цудоўныя артысты, як быццам яны заўжды ў нас займаліся. Але гэта рэдкасць, калі з першага позірку бачны патэнцыял: звычайна патрэбны час, каб раскрыцца, каб прывучыць дзіця да сцэны — ёсць пастаноўкі, дзе нашы дзеці ходзяць літаральна за руку з артыстамі хору, пакуль усвядомяць, што значыць — працаваць разам з вялізным калектывам і быць яго часткай. Згадваю хормайстра Алу Мазураву, у яе ўзорны хор «Званочкі» ў ліцэі пры Акадэміі музыкі. Я прыйшла ў тэатр, калі яна ўжо тут працавала, — і вельмі добра запомніла, што яна нікога ніколі не выганяла. У каго атрымлівалася — спявалі, калі не — слухалі, спрабавалі разам з усімі дыхаць і распявацца. І ў канцы года з дзесяці, здавалася б, безнадзейных вучняў восем у яе пачыналі нешта гудзець, кеміць, падладжвацца. Так што цяпер я дакладна ведаю, што пры наяўнасці слыху — абсалютна ўсё магчыма развіць. Іншая рэч, калі людзі займаюцца вакалам не зважаючы на прыродныя даныя, проста таму, што гэта модна, а патраціўшы на прыватныя ўрокі шмат часу і грошай, «раптам высвятляюць», што слыху няма. Я ўсімі рукамі за ўсебаковае развіццё асобы, але не за тое, каб усё хапаць па вярхах, — гэта нейкая бяда, у выніку якой сёння ўсе лічаць сябе «спецыялістамі» ў фатаграфіі, ці вакале, ці педагогіцы....

Зусім неабавязкова ўдзельнікі нашай студыі стануць прафесійнымі артыстамі, але многія вырастаюць і вяртаюцца ў тэатр. Напрыклад, канцэртмайстар Таццяна Панасюк — выпускніца студыі, гэтаксама як рэжысёр Наталля Бараноўская, хормайстар Алена Сакалоўская, салістка Вялікага тэатра Таццяна Гаўрылава, загадчык пастаноўчай часткі тэатра Таццяна Ераза, памочнік рэжысёра Алена Макарава, рэжысёр Наталля Кузьмянкова, кампазітар Каця Шымановіч — ужо яе дачка Фрося ходзіць да нас. І папулярны спявак Іван Вабішчэвіч — Дзядзька Ваня, і расійскі спявак і кампазітар Глеб Матвяйчук, і кумір моладзі Ціма Беларускіх — усё гэта выпускнікі нашай студыі.

Ужо ў лістападзе-снежні пачынаецца вельмі напружаны час, калі раніцай адзін спектакль, увечары другі, а паміж імі яшчэ стаяць рэпетыцыі... Бывае, за месяц шаснаццаць «Шчаўкункоў»! І ва ўсіх гэтых пастаноўках занятыя студыйцы — мабыць, з оперных спектакляў нас няма толькі ў «Аідзе» і «Вяселлі Фігара», плюс яшчэ некалькі балетаў, шматлікія навагоднія канцэрты, масавыя мерапрыемствы. Я не ведаю, як яны «выжываюць»: некаторыя робяць школьныя заданні ў рэпетыцыйных класах, але не прапускаюць заняткі, бо захопленыя тэатрам, і ім гэта сапраўды трэба.

***— Што варта зрабіць бацькам і дзецям, перш чым ісці да вас на праслухоўванне?***

— Варта даведацца, ці хоча дзіця наогул спяваць — ведаю, нават у многіх музычных школах вучні цярпець не могуць спяваць у хоры. Добра, што многія бацькі здагадваюцца спытаць, ці займаюцца ў нас танцамі, і калі высвятляецца, што будуць толькі харавыя спевы, то сыходзяць.

Калі ў вас творчая сям'я, гэта не гарантыя поспеху — талент ёсць альбо няма, і дзіця можа як працягнуць дынастыю, так і быць адзіным у сваім родзе. Наогул, мне здаецца, да патрэб і інтарэсаў дзіцяці трэба больш прыслухоўвацца, і калі яму падабаецца шыць сукенкі лялькам, то, магчыма, няхай шые, а не змушана апраўдвае вашы чаканні?

***— Працуючы з дзецьмі амаль 30 гадоў, як пазбегчы прафесійнага выгарання?***

— Гэта наогул не наша гісторыя, бо тут пастаянна ўсё змяняецца: новыя спектаклі, новыя дзеці прыходзяць кожны год — такая чахарда падзей, якая не ператвараецца ў руціну. У параўнанні са школай у нас ёсць пэўныя рычагі ўздзеяння на вучняў, дый, паўтаруся, у студыю прыходзяць ужо матываваныя дзеці, якім няма сэнсу выхваляцца аднаму перад адным, бо ім цікава ў тэатры. Натуральна, бываюць розныя абставіны, але ўсе пытанні можна вырашыць, прычым наўпрост з дзецьмі, бо з імі знайсці агульную мову лягчэй, чым з бацькамі.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## Дасье «Звязды»

**Дзіцячы музычны тэатр-студыя ў складзе Вялікага тэатра Беларусі з'явіўся ў 1989 годзе — і цяпер, а тым больш на той час, гэта ўнікальная з'ява. Ужо праз год першыя выхаванцы студыі дэбютавалі ў вялікім канцэрце з сімфанічным аркестрам, а таксама выступілі як паўнапраўныя ўдзельнікі мюзікла «Пітэр Пэн».**

**Сёння юныя артысты занятыя больш чым у 17 оперных пастаноўках, балетных спектаклях, у якіх ёсць дзіцячы хор: «Стварэнне свету» (цалкам ідзе ў суправаджэнні дзіцячага хору), «Эсмеральда», «Карміна Бурана» і «Шчаўкунок», «Маленькі прынц», а яшчэ ў трох дзіцячых спектаклях — «Чароўная музыка», «Доктар Айбаліт», «Церам-Церамок». Па выніках адбору, які праходзіць у пачатку новага тэатральнага сезона, у дзіцячую студыю штогод прыходзяць новыя вучні, якія становяцца часткай вялікага калектыву, засвойваюць акцёрскае майстэрства і часта выбіраюць творчую прафесію. Так, тутэйшых выпускнікоў можна ўбачыць і пачуць у тэатрах Беларусі, Расіі, Чэхіі, Германіі.**



Студыйцы ў пастаноўцы «Багема» Джакома Пучыні — дарэчы, адной з самых выконваемых опер у свеце.

# ВАГОН-ЛАЎКА І ВАГОН-КЛУБ

Маці збіраецца ў вагон-лаўку, якая, як і вагон-клуб, прыязджае на станцыю адзін раз у месяц. У чыгуначную лаўку пускаюць толькі чыгуначнікаў. А хто ж не ведае на вуліцы і нават у пасёлку, хто такі Дарынчын бацька? Усе ведаюць, бо Дарынчын бацька — чыгуначнік! Ды яшчэ і які: ён адукаваны і таму працуе начальнікам — брыгадзірам рабочых-пуцейцаў. А яшчэ ён дапамагае большаму начальніку, дарожнаму майстру, рабіць справаздачы, бо ў яго такі прыгожы почырк — на заглядзенне. Нейкі калігра... каліграфічны. Правільна вымаўляць гэтае слова яе навучыў брат. Дарынка ледзь язык не зламала, завучваючы яго. Калі бацька робіць тыя справаздачы, дык прыносіць дамоў лічыльную машынку — арыфмометр называецца. Дарынка з Шуркам нават круціла на ім ручкай. Праўда, адхапіла разам з братам прачуханца за гэта, бо пасля іх кручэння той арыфмометр бацьку давялося несці назад у кантору, а потым везці на рамонт у Гомель, у тую самую дыстанцыю. Пасля гэтага здарэння бацька замыкаў машынку ў спецыяльнай скрыньцы на маленькі замочак.

З вагона-лаўкі бацькі прыносяць усяго-ўсякага: цукеркі, розныя крупы, белую муку, макарону. Галоўнае для Дарынкі і меншага з братоў, канешне ж, цукеркі, а большыя браты і сястра цікавяцца прамтаварамі. У вагоне-лаўцы прывозяць і іх.

А аднаго разу бацька прынёс на плячы нейкі доўгі скрутак. Вочы маці свяціліся задавальненнем: «Ну во, і ў нас будзе як у людзей», — сказала яна, калі бацька апусціў яго на падлогу ў зале і пачаў развязваць шпагат. Дзеці абкружылі бацькоў і з нецярплівасцю чакалі, што ж там за цуд такі? Скрутак аказаўся самым сапраўдным крамным дываном. На яго бацька запісваўся ў чаргу. «Віцебская фабрыка», — прачытаў Мацвей на этыкетцы, прыклеенай на тым дыване. Яго прымацавалі над ложкам бацькоў у зале. Потым бацькі прынеслі з вагона-лаўкі крамныя палавікі-дарожкі. Яны былі зялёнага колеру з палосамі па баках. Новыя палавікі засцялілі таксама ў зале, а самаробныя перамясцілі ў вітальню-сталовую.

Вагон-лаўка — штука насамрэч цікавая, але вагон-клуб нашмат цікавейшы. Ён прывозіць на іх станцыю кіно. Дарынка ўсё ніяк не дачакаецца, калі ж і яна пойдзе ў тое кіно на колах.

Нарэшце дачакалася. Ёй пашанцавала — бацькі ўзялі яе з сабой. У кіно папрыходзілі чыгуначнікі з восаўскай і маканавіцкай брыгад. Дарынка сядзела на руках у бацькі.

«Вірынея» — так называўся фільм. Вячаслаў Шалевіч, Вячаслаў Нявінны, Людміла Чурсіна на ўсё жыццё засталіся ў памяці маладымі, прыгожымі. Потым, калі ўжо вырасла, чамусьці больш ніводнага разу не давялося пабачыць «Вірынею».

**Раіса ДЗЕЙКУН.**


## ВНИМАНИЕ

**Янушковичский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 28 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь зем. участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации, рекламе |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Д. Хоружинцы, Лесная, 9 кадастровый номер 623288016101000077 | 0,1285 га | Возможность подключения к водопроводу | 4000,00 | 800,00 | 1323 руб. 41 коп. + расходы за рекламу |
| 2 | Д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 27А, кадастровый номер 623288001601000094 | 0,2125 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 6000,00 | 1200,00 | 1356,96 руб. + расходы за рекламу |
| 3 | Д. Мочулище, ул. Полевая-1Б, кадастровый номер 623288010101000022 | 0,1599 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 4000,00 | 800,00 | 1323 руб. 41 коп. + расходы за рекламу |
| 4 | Д. Жабичи, У-3, кадастровый номер 623288005101000022 | 0,2427 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 6000,00 | 1200,00 | 1356,96 руб. + расходы за рекламу |
| 5 | Аг. Калачи, ул. Центральная, 53А, кадастровый номер 623288006101000104 | 0,2500 га | Возможность подключения к водопроводу, электроснабжению, асфальтовое покрытие к подъезду участка | 7300,00 | 1460.00 | 1323 руб. 41 коп. + расходы за рекламу |

Задаток перечисляется на р/счет: BIC: AKBBBY2X; счет № BY35AKBB36006191711040000000 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк» УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. **Аукцион состоится 28 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10.**

**Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 21 октября 2019 г. (последний день подачи заявления 21 октября 2019 г. до 17.00) по адресу: Минская область, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10.**

**Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, (8 01774) 57 4 99.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ООО «Оксана»

**Предмет торгов —** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-1556 (наименование — здание социально-культурного центра; назначение — здание специализированное иного назначения), площадью 1879 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121284004601000037, площадью 1,3028 га, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Городская, 23

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **362 600,00** | **Размер задатка, руб.** | **36 260,00** |
| **Условия продажи** | без условий | | |
| **Организатор аукциона** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | в соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 | | |

**Аукцион состоится 8 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, а также иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений — 7 октября 2019 г. до 17.00**

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона

* Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ООО «Оксана» опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2019 г.

Минский городской центр недвижимости

**Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 29 октября 2019 г. проводит открытый аукцион с условиями № 09-У-19 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, ул. Кабушкина | 0,5800 | Для строительства объекта «Торговый объект по ул. Кабушкина» | 154 525,22 | 23 000,00 | 8 016,89 | Демонтаж существующей автостоянки | 56 200,00 |
| 2 | г. Минск, пер. Ольшевского | 0,3286 | Для строительства объекта: «Объект производственного назначения по пер. Ольшевского в производственной зоне 18ПЗ в г. Минске» | 76 220,84 | 11 000,00 | 11 192,44 | Снос зданий и сооружений по ул. Бирюзова, 12А, попадающих под пятно застройки | 181 107,36 |

Возмещение убытков и потерь сельскохозяйственного производства производится лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.
Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.
Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.
Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).
Аукцион состоится: **29 октября 2019 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.
**Для участия в аукционе необходимо:**
**внести задаток не позднее 24 октября 2019 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X, УНП 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;
представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:
- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;
- подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;
*дополнительно представляется:*
индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.
При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.
Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу:
г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 27 сентября 2019 г. по 24 октября 2019 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).
Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона** в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:
- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под подпись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**
** - единственный участник несостоявшегося аукциона также в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка обязан выполнить условия, предусмотренные в указанном решении, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.
Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.
После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения), Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).
Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.
Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by

## ЗАКРЫЛІ МОСТ ЦЕРАЗ ПЦІЧ

**Драўляны мост цераз раку Пціч на аўтадарозе каля вёскі Ражаноў Акцябрскага раёна атрымаў пашкоджанні.**

Як паведамляе МНС, мост з'яўляецца часовым да моманту завяршэння рамонту асноўнага жалезабетоннага. Работнікі ДРБУ правялі абследаванне канструкцый, падчас якога выявілі дэфекты, што сведчаць аб аварыйным стане. У мэтах прадухілення абвальвання рух аўтатранспарту быў забаронены. Работнікамі МНС і службамі ўзаемадзеяння праправавана пытанне аб'езду, а таксама перанакіравання транспартных сродкаў. Жыхароў раёна МНС абвясціла з дапамогай СМС-рассылкі. Аб'езд ажыццяўляецца па аўтадарозе Н4265 да вёскі Катка Глускага раёна і па дарозе Р-34 (32 км).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ООО «Облмехотряд» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» проводит торги по продаже имущества предприятия.

**Продавец:** ООО «Облмехотряд» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК».
**Организатор торгов:** РУП «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь», 220030, г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513. Руководитель организатора электронных торгов – Вашемирский Максим Петрович; тел.: 200-64-11, тел./факс: 200-95-63, 200-73-33, https://torgi.gov.by/.
Публичные торги в электронной форме в процедуре ликвидации (далее – электронные торги) будут проведены: 1 ноября 2019 г., в 8.00, на электронной торговой площадке https://torgi.gov.by/, окончание – 1 ноября 2019 г., 16.00.
**Заявки принимаются с 30 сентября 2019 г. по 31 октября 2019 г. включительно.**
Шаг аукциона 5 %.
Для участия в торгах необходимо:
1. Перечислить задаток по выбранному лоту в размере 5 % от начальной цены,
2. Подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте https://torgi.gov.by/.
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат на организацию и проведение торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения на основании представленного организатором торгов либо продавцом извещения о возмещении затрат.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 7 рабочих дней со дня проведения торгов.
Срок оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Более подробная информация о проведении торгов на сайте https://torgi.gov.by

| № лота | Предмет торгов | Место нахождения | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Полуприцеп самосвальный ПСТ-9 2013 г., инв. № 00000136 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 8520,00 | 426,00 | 426,00 |
| 2 | Полуприцеп самосвальный ПСТ-9 2013 г., инв. № 00000137 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 8520,00 | 426,00 | 426,00 |
| 3 | Косилка КДН-3,1, инв. № 00000105 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 5160, 00 | 258,00 | 258,00 |

УНП 690237064

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY.

Продавец: унитарное предприятие «Строительно-монтажное управление «ПОДЬЕМ» (УНП 192522108) в лице ликвидатора Регися Алексея Альбертовича, тел. + 37529 378-83-88.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **9 октября 2019 г.** 09.00—17.00 на электронной торговой площадке BELTORGI.BY

| № п/п | Инв. № | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб., с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | 44072 | Зигмашина И-2714 | 312,00 |
| 2 | 44201 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 2 856,00 |
| 3 | 44204 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 2 856,00 |
| 4 | 44205 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 2 856,00 |
| 5 | 44216 | Лебедка ЛМ-2 | 396,00 |
| 6 | 44224 | Лебедка электрическая 5тн. | 828,00 |
| 7 | 44144 | Пресножницы Нв-5221 | 1 002,00 |
| 8 | 44132 | Пресс К2320 | 468,00 |
| 9 | 44106 | Пресс-ножницы с-229а | 210,00 |
| 10 | 47864 | Принтер EPSON Stylus Pro 7700 | 1 038,00 |
| 11 | 44049 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 546,00 |
| 12 | 44067 | Станок точильно-шлиф.3Б632 | 378,00 |
| 13 | 44151 | Станок фальцепрокатный СТД-16А | 834,00 |
| 14 | 47892 | Автоматический воздушный компрессор (НТА-120) | 1 284,00 |
| 15 | 572 | Бытовка для рабочих б/у | 1 326,00 |
| 16 | 210103 | Вагон-бытовка | 408,00 |
| 17 | 100406 | Вагон-домик | 372,00 |
| 18 | 141621 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 114,00 |
| 19 | 141615 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 114,00 |
| 20 | 141623 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 114,00 |
| 21 | 141624 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 114,00 |
| 22 | 141617 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 114,00 |
| 23 | 141625 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 114,00 |
| 24 | 160603 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 114,00 |
| 25 | 141601 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 114,00 |
| 26 | 141609 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 114,00 |
| 27 | 141607 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 114,00 |
| 28 | 66 | Станок заточный | 378,00 |
| 29 | 180 | Гибкий эндоскоп ЭТГ 10-1.5 | 792,00 |
| 30 | 185 | Ультразвуковой толщиномер БУЛАТ-1S | 270,00 |
| 31 | 4222 | Кран-балка | 1 782,00 |
| 32 | 573 | Приемник П-900 | 354,00 |
| 33 | 147510 | Электронный теодолит АНТОК | 300,00 |
| 34 | 410147866 | Машина для обработки кромок ВМ-20 | 456,00 |

Местонахождение — п. 1, 5—9, 11—15 — г. Бешенковичи, п. 2—4 — г. Заславль, п. 16, 17 — г. Слуцк, п. 10, 18—34 — г. Минск, ул. Вильямса 37а, телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 08.10.2019 г. 17.00** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель — ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов — 5 %, задаток — 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2019 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА Государственного предприятия «Островецкая МПМК-158»

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. (без НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1** — капитальное строение с инвентарным номером 442/С-8430 (наименование: диспетчерская; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 45,2 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39, на земельном участке с кадастровым номером 424655100001000237 | 6 500,00 | 650,00 |
| **Лот № 2** — изолированное помещение с инвентарным номером 442/D-1259 (наименование: производственное помещение; назначение: производственное помещение), площадью 1259,5 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39 | 116 000,00 | 11 600,00 |
| **Лот № 3** — капитальное строение с инвентарным номером 442/С-10560 (наименование: гараж на 24 автомашины; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 1111,0 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39, на земельном участке с кадастровым номером 424655100001000237; капитальное строение с инвентарным номером 442/С-8435 (наименование: мехмастерская; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 323,0 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39, на земельном участке с кадастровым номером 424655100001000237; капитальное строение с инвентарным номером 442/С-10553 (наименование: сварочная; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 27,1 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39/4, на земельном участке с кадастровым номером 424655100001000237. Составные части и принадлежности: пристройка блочная облиц. кирпичом (1) | 88 200,00 | 8 820,00 |
| **Лот № 4** — капитальное строение с инвентарным номером 442/С-10050 (наименование: гараж на 3 автомашины; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 67,5 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39, на земельном участке с кадастровым номером 424655100001000237. Составные части и принадлежности: одноэтажное панельно-кирпичное здание гаража на 3 автомашины (Г1/к) | 4 800,00 | 480,00 |
| **Лот № 5** — капитальное строение с инвентарным номером 442/С-8433 (наименование: лесопилорама; назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), площадью 837,0 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39, на земельном участке с кадастровым номером 424655100001000237 | 51 600,00 | 5 160,00 |
| **Лот № 6** — капитальное строение с инвентарным номером 442/С-8431 (наименование: котельная; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 220,0 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Островецкий р-н, г. Островец, ул. Карла Маркса, 39, на земельном участке с кадастровым номером 424655100001000237 | 14 500,00 | 1 450,00 |
| **Лот № 7** — прицеп 1-ПТС-9, год выпуска 1990 г., регистрационный знак ЮГ 1933 | 1 300,00 | 130,00 |
| **Лот № 8** — экскаватор категория «F» ЭО 2621, год выпуска 1988 г., регистрационный знак СВ-4 0293 | 2 880,37 | 288,04 |
| **Лот № 9** — микроавтобус вагон GAZ-22171, год выпуска 2004 г., регистрационный знак АВ 5765-4 | 520,19 | 52,02 |
| **Лот № 10** — трактор категория «А» Беларус-920, год выпуска 2007 г., регистрационный знак СА-4 8734 | 2 979,87 | 297,99 |
| **Лот № 11** — трактор категория «С» ДТ-75 ДЕРС-2, год выпуска 2008 г., регистрационный знак СА-4 0264 | 11 132,80 | 1 113,28 |
| **Лот № 12** — автоматизированный растворобетонный узел БМ УЛГФ.0001 30К 080609/054, инвентарный номер 260 | 32 548,79 | 3 254,88 |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | Государственное предприятие «Островецкая МПМК-158», 231201 Гродненская обл., г. Островец, ул. К. Маркса, 39, УНП 591688100 |
| **Организатор аукциона** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» |
| **Р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |
| **Условия продажи** | без условий |
| **Обременение** | наличие действующих договоров аренды |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Информация о возмещении затрат** | участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона |

**Аукцион состоится по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 29 октября 2019 г. в 11.00 (по лотам № № 1-6), в 14.00 (по лотам № № 7-12).**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, а также иную информацию, можно узнать у организатора аукциона по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

**Последний день приема заявлений — 28 октября 2019 г. до 17.00**

## Извещение о проведении 16 октября 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| **Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов** | **Местонахождение** | **Начальная цена с учетом НДС, бел. руб.** | **Размер задатка, бел. руб.** |
| Изолированное помещение общей площадью 145,3 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 500/D-1004494 (наименование — административное помещение; назначение — административное помещение) | г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 120Б, пом. 5 | 304 800,00 | 30 400,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Банк Дабрабыт», ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, 220002, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 16 октября 2019 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.09.2019 по 14.10.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017)239-19-26 (ОАО «Банк Дабрабыт»)

Страховой полис ОСГО ВТС РБ серии НА № 0672136-138, полис по добровольному страхованию от болезней и НС на время поездки за границу серии БА №№ 1596295,1539225, квитанцию о приеме наличных денежных средств серии СВ № 4536792 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

УНП 100357923

## Мамін дзённік

# Фанат машын

Летась трактары і камбайны, якія туды-сюды ганяюць па вёсцы, мяне, мякка кажучы, раздражнялі. Не паспее малы на вуліцы заснуць, як такі гул стаіць, што хочаш не хочаш расплюшчыш вочкі. А тым больш калі такі далікатны (нават цяпер варта паправіць коўдрачку і накрыць ножкі-басячкі, якія вылезлі з-пад яе, Арцёмка ўжо пачынае варушыцца).

Гэтым летам сельскагаспадарчую тэхніку, якая працягвае ездзіць па вясковых дарогах, я нават люблю. За тое, што хоць некалькі хвілін магу пастаяць спакойна, бо мой маленькі сынок адразу перастае сваволіць і кудысьці ісці — быццам заварожаны глядзіць на трактар ці іншую гуллівую махіну, якая паказалася на гарызонце.

У горадзе так не расслабішся. Варта было пасля трохмесячнай «ссылкі» ў вёску прыехаць у Ліду, дзе мы таксама часова жывём, як Цёмікавы вочкі разбягаліся ад такой колькасці аўтатранспарту. Мала што яму трэба было дакрануцца (а то і панаціскаць на ручкі, паляпаць па фарах) да кожнай машыны на паркоўцы, дык яшчэ і па дарозе пабегаць захацелася. Абмежаванне свабоды малому, канешне, не спадабалася. Ён прызвычаіўся хадзіць, дзе яму ўздумаецца, а тут то адно нельга, то другое. На нашай вясковай дзіцячай пляцоўцы ўзяў суседчын самакат ды пацягнуў, пакуль тая не кінецца ў плач (а ён яшчэ падумае, аддаваць ці не). У гарадской краме такая хітрасць не пракаціла — сігналізацыя патрабавала вярнуць цацкі на месца.

А на дні горада, куды мы нядаўна выбраліся з сям'ёй, Цёмік нават разгубіўся ад такой колькасці людзей. На дзіва спакойна сядзеў у калясцы, што звычайна для яго выпрабаванне. Праўда, пакатаўся і на машынцы на пульце кіравання, паслухаў з бабуляй, як граюць саксафаністы, відаць, пазайздросціў дзецям, якія асядлалі поні і аслоў. Але пра што ён расказваў сваімі «а» і «ў» дома, паказваючы пальчыкам на столь, дык гэта пра верталёт, які за невялікія грошы дэманстраваў жыхарам і гасцям свята Ліду з вышыні птушынага палёту. Мы, вядома, не лёталі, але ўся ўвага была сканцэнтравана на вінтакрылай машыне.

Цёміку пашанцавала ўбачыць верталёт зусім зблізку і на наступны дзень, калі мы паехалі ў той раён, дзе акурат знаходзілася ўзлётная пляцоўка, у цырульню. Нажніцы шчоўкалі над маленькай галоўкай упершыню (валасы ў Арцёмкі растуць слабавата), а ён спакойна сядзеў. Мае бацькі дзівіліся, як удалося засунуць малога непаседу ў крэсла да цырульніка. Аказалася вельмі проста, калі гэтае крэсла — машына. Цёмік круціў цацачны руль і краем вока пазіраў на мульцікі, якія цёця Наташа спецыяльна ўключыла для яго (сэрвіс!) — і хутка маленькі пучок светленькіх валасоў ляжаў у мяне ў пакеціку — на памяць аб першым паходзе ў цырульню.

Чаго толькі няма ў сучасных дзяцей! Яшчэ нядаўна я вазіла (добра, што машына ёсць) з кватэры ў кватэру ванначку, каляску, фітбол (вялікі мячык для гімнастыкі), шэзлонг, крэсла для кармлення, каб Цёміку было камфортна на новым месцы. Я ўжо не кажу пра сумкі адзення і іншыя рэчы. Прыкладна з такім багажом прыехала на днях да свекрыві і другая нявестка, у якой, між іншым, двое дзяцей. Сабраліся мы разам, заставілі сваімі рэчамі трохпакаёвую кватэру і адчулі, што цеснавата неяк стала. А як жа ў маленькай хатцы некалі па дзве-тры сям'і туліліся!

Затое весела было. Не ўпэўнена наконт нашых продкаў, але нам дакладна. Па вечарах нашы хлопцы ўвогуле на галовах хадзілі. Машыны пад нагамі былі паўсюль, шапкі іх прадзядулі-ветэрана і прымяраліся, і падкідаліся (хай не прачытае гэта дзядуля Саша). І смяяліся, і плакалі — мой шкоднік забіраў у пяцімесячнай сястрычкі ўсе цацкі, аднойчы не згледзелі, як увогуле трактарам у галоўку патрапіў. Прабачэння, канешне, прасіў. Толькі невядома, што лепш: для немаўляткі Цёмікавы абдымкі і пацалункі былі залішній праявай любові.

І Вадзіку, якому праз некалькі месяцаў споўніцца сем, дасталося ад малога шкодніка. Таму не дзіва напрыканцы нашай сустрэчы было ад яго пачуць, што ён не хоча, каб Арцёмка прыязджаў да яго ў госці. Дарэмна спалохаліся. Аказалася, ён турбуецца, каб малодшаму брату, як яму, не стала дрэнна ў дарозе (яны жывуць далёка). Такім чынам, злапамятных у нас няма. Спадзяюся, маленькая Ева некалі не прыпомніць Цёміку трактар, які пакінуў на яе маленькім лобіку невялічкую драпіну.

**Вераніка КАНЮТА.**

## Мама, пачытай!

# ШАРЫК


Фота носіць ілюстрацыйны характар.

У суботу тата выправіўся на рыбалку, а мы з мамай — у горад. Збіраліся схадзіць у парк і пакатацца на каруселях.

У парку час прайшоў незаўважна. Накатаўшыся на атракцыёнах, паласаваліся марожаным і цукровай ватай. І толькі надвячоркам заспяшаліся дадому.

Вярталіся мы не тым маршрутам, што звычайна, бо мама хацела зайсці ў краму, якая нядаўна адчынілася і пра якую шмат хто з нашых суседзяў добра адгукаўся. І хоць набыла яна толькі таматны сок, але крамай засталася задаволеная. Сказала, што зазірне ў яе іншым разам.

Калі ісці з таго боку да нашага дома, трэба спускацца ў падземны пераход. І мы скіравалі да яго. Там і ўбачылі невялічкага сабачку, падобнага на дварняка. Ён ляжаў каля сцяны і глядзеў на мінакоў сумнымі вачыма.

Спачатку мама падумала, што ён бяздомны, але, прыгледзеўшыся, убачыла ашыйнік. Стала зразумела — сабачка згубіўся і вельмі перажываў з-за гэтага.

— Мы яго тут не пакінем, — сказала мама і паклікала: «Шарык, Шарык...»

Сабачка ўмомант ажывіўся, падняўся і замахаў хвастом.

— Здаецца, я ўгадала, — усміхнулася мама і зноў звярнулася да Шарыка: «За намі, Шарык!»

Шарык пайшоў следам. Так ён і апынуўся ў нашай кватэры.

Тата ўжо быў дома. Убачыўшы чацвераногага госця, здзівіўся:

— Цяпер ён будзе жыць з намі? Няўжо Насця захацела завесці сабачку? — тата зірнуў на мяне.

— Не. Шарык пажыве з намі часова, ён згубіўся. Мы пастараемся знайсці яго гаспадара, — патлумачыла я.

— Ну вы без гісторый выйсці пагуляць не можаце, — усміхнуўся тата. — А я карпа злавіў!

— Віншуем! — адказала мама. — Але на яго ў мяне пакуль няма часу.

Мама разагрэла ў мікрахвалёўцы некалькі катлет, якія смажыла яшчэ раніцай, паклала іх на талерку і паставіла перад Шарыкам. Той спачатку панюхаў іх, а потым стаў прагна есці. Відаць, і сапраўды прагаладаўся.

Павячэралі і мы. Потым тата стаў займацца карпам, а мы — Шарыкам.

Спярша добра агледзелі ашыйнік. На ім сапраўды значылася імя Шарык. Мама задаволена ўсміхнулася.

— Цяпер ёсць такія ашыйнікі, у якіх мікрачып. Па ім гаспадары могуць знайсці свайго гадаванца, дзе б ён ні быў! — паведаміў з кухні тата.

— Сапраўды, — пагадзілася мама. — Але на ўсякі выпадак мы сфатаграфуем Шарыка, напішам аб'яву, раздрукуем дзясятак экзэмпляраў, а заўтра павесім паблізу ад нашага дома і таго месца, дзе знайшлі сабачку.

Праз дваццаць хвілін усё было гатова. Тата скончыў скрэбці карпа, і мы ўсе разам селі глядзець тэлевізар. Каля нашых ног на дыване лёг і Шарык.

На наступны дзень мы з мамай расклеілі аб'явы.

Чакаць давялося не так доўга. Ужо вечарам патэлефанаваў мужчына, які быў вельмі рады, што мы знайшлі яго. Аказалася, што сабачка згубіўся якраз каля новай крамы, калі гаспадары зазірнулі туды. Гаспадароў звалі Сяргей і Маша. Яны прыйшлі да нас вечарам, а да той пары я двойчы паспела пагуляць з Шарыкам на вуліцы.

Госці прынеслі торт — у якасці пачастунку і падзякі. Разам з імі мы пілі гарбату. Высветлілася, што Сяргей — такі ж аматар-рыбалоў, як і наш тата. У іх вельмі хутка завязалася размова, і яны вырашылі ў найбліжэйшыя выхадныя адправіцца на рыбалку. Ну а Маша, якая вельмі любіць атракцыёны, не адмовілася схадзіць у парк разам з мамай і са мной.

Так дзякуючы Шарыку мы знайшлі новых сяброў.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ПАКАШТУЙЦЕ!

## Катлеткі па-гавайску



***Спатрэбіцца:** 400 г курынага філе, 150 г кукурузы, 2 салодкія перцы, 1 цыбуліна, 2-3 зубкі часнаку, 1 яйка, 2 ст. л. манкі, 1 ст. л. мукі, 150 г кабачка, 1 невялікая морква, спецыі, соль.*

Мяса здрабняем. Дробна наразаем цыбулю, моркву надзіраем на дробнай тарцы. На буйной тарцы надзіраем кабачок і адціскаем сок.

Здрабняем часнок. Перац наразаем не вельмі дробна. Усё добра перамешваем і дадаём кукурузу, яйка, манку, спецыі і соль. Катлеткі абвальваем у муцэ і смажым на ўмераным агні.

## Маннік з сухафруктамі

***Спатрэбіцца:** крупы манныя — 1 шклянка; смятана — 1 шклянка; цукар — 1 шклянка; яйка — 2-3 шт.; сода — 0,25 ч. л.; ванілін — на смак; арэхі грэцкія, разынкі, курага — на смак.*



Змяшаць смятану, манку і пакінуць на дзве гадзіны для набракання. Дадаць яйкі, цукар, ванілін, гашаную (воцатам ці кіпенем) соду. Дадаць разынкі, арэхі, курагу (хто што любіць). Дно бляхі прамазаць алеем, выліць цеста. Змясціць у разагрэтую духоўку і запякаць да гатоўнасці (хвілін 40).

### СЕЗОН НАРЫХТОВАК

## Перац, фаршыраваны баклажанамі

***Спатрэбіцца на 1-літровы слоік:** перац балгарскі (сярэдні) — 5 шт., баклажаны (сярэднія) — 2 шт., кроп — 1 пучок, пятрушка — 1 пучок, часнок (сярэднія галоўкі) — 2 шт, перац духмяны (гарошыны) — 3 шт., лаўровы ліст — 1 шт. **Для марынаду:** вада — 125 мл, цукар — 50 г, соль — 0,5 ст. л., воцат (9 %) — 25 мл. Алей для смажання.*



Балгарскі перац мыем, выдаляем насенне. Адварваем у кіпячай вадзе дзве хвіліны, дастаём і адкладаем убок. Баклажаны чысцім і наразаем уздоўж палоскамі таўшчынёй па 0,5 см.

Абсмажваем палоскі баклажанаў на алеі да залацістага колеру з двух бакоў, трохі прысольваючы. Па неабходнасці падліваем алей. Зяленіва дробна сячом, часнок здрабняем. Старанна змешваем іх. На палоскі баклажанаў выкладваем зяленіва з часнаком і згортваем рулецік. Затым гэтымі рулецікамі начыняем перац. На дно слоіка кладзём лаўровы ліст і духмяны перац-гарошак. Укладваем начынены перац.

***Рыхтуем марынад:*** ваду з цукрам і соллю кіпяцім, дадаём воцат, заліваем перцы і ставім слоікі стэрылізавацца на 20 хвілін. Па заканчэнні стэрылізацыі закатваем і ахінаем да астывання. Закуска выдатна захоўваецца пры пакаёвай тэмпературы.

### РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА



• «Унутранасці» сумачкі можна прыбраць шчоткай на клейкай аснове.

• **Раствор для кантактных лінзаў дапаможа ажывіць туш, якая засохла.**

• Жэлейныя цукеркі можна выкарыстаць замест бляску для вуснаў.



• **Выкарыстоўвайце гумку для ідэальнага французскага манікюру.**

• Панчоха можа замяніць будаўнічы дзюбель. Для гэтага дастаткова запіхнуць капрон у прасвідраваную адтуліну і расплавіць яго ўнутры гарачым цвіком. Усё, дзюбель гатовы.

• **Сантэхнічнае прымяненне. Абматаная панчохай цеча з абмазкай паверхні цэментным растворам становіцца надзейным выхадам з непрыемнай сітуацыі.**



• Падыходзяць калготкі і ў аўтамабільным рамонце. Рэмень генератара, які раптам парваўся ў дарозе, можна з поспехам замяніць капронавай панчохай. На ёй да майстэрні дакладна даедзеце.

*ДАЙ БОЖА СТАРОМУ ВОЧЫ, А МАЛАДОМУ РОЗУМ (беларуская народная прымаўка)*

# ПАТРУЛЬНАЯ ТАЦЦЯНА ЗАСТУПАЕ НА ДЗЯЖУРСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

—У мяне характар такі баявы, як у таты, — тлумачыць Таццяна. — Напэўна, таму і марыла быць міліцыянерам.

Дарэчы, бацькі якраз і не вельмі адабраюць яе выбар. Перажываюць — як-ніяк дзяўчына, не хочацца ім, каб іх дачушка сутыкалася з не вельмі прыемным кантынгентам. Хоць цяпер будзе бацькам падарунак. Возьмуць з раніцы сваю любімую газету «Звязда», а там іх Таццяна — герой артыкула.



## Пахудзець? Не праблема!

У міліцыю Таня прыйшла з «грамадзянкі». Скончыла БДТУ, атрымала прафесію інжынера, хіміка-тэхнолага. Выйшла на работу. Але не адчувала сябе на сваім месцы. Не давала спакою яе дзіцячая мара. Так у 24 гады звольнілася з работы і пайшла ў спецыяльны вучэбны цэнтр для міліцыі.

— Паверце, там падрыхтоўка, што трэба, — упэўнівае Таццяна. — Чатыры з паловай месяцы неверагоднай фізічнай і маральнай працы. Без такой падрыхтоўкі ў міліцыю не трапіць. Лёгка дакладна не было! Там знаходзішся цэлыя суткі — у краму не схадзіць, часу ўвогуле няма, ранні пад'ём і строгі рэжым. За той час у «вучэбцы» я скінула адзінаццаць з паловай кілаграмаў. Гэта ж мара многіх дзяўчат! Але не хвалюйцеся, кармілі нас добра — не галадалі. Проста нічога лішняга, фізічная падрыхтоўка і рэжым.

Ды і цяпер Таццяна наўрад ці паправіцца. Яна пешы патруль, а гэта каля сарака тысяч крокаў у дзень. Калі дзяўчына прыходзіць на змену, яна атрымлівае рабочы маршрут. Вось і сёння яна атрымала ўжо дзве карткі-маршруты. Чакаем яе напарніка, старшага сяржанта міліцыі роты ППСМ Віталя Грабка.

— Мы не маем права пакідаць маршрут, за выключэннем выпадкаў, калі нас выклікае аператыўна-дзяжурная служба на візіт, — расказвае Таццяна пра сваю работу. — Кожны з нас ведае небяспечныя месцы раёна, дзе найчасцей здараюцца злачынствы, і кватэры з рэпутацыяй «прытона». Мы ўжо ведаем, куды спяшацца, калі здараецца тэрміновы выклік.

Такія выклікі мне здаюцца небяспечнымі. Таццяна супакойвае: перад кожнай рабочай зменай патрульныя праходзяць інструктаж, успамінаюць некаторыя баявыя прыёмы, атрымліваюць спецыяльныя сродкі: пісталет, міліцэйскую дубінку, рацыю, газавы балончык. Дарэчы, апошнюю прыладу Таццяна больш за ўсё любіць.

— Часта маем справу з нецвярозымі людзьмі, якія, убачыўшы перад сабой міліцыянера-жанчыну, пачынаюць грубіць і «распускаць рукі», — гаворыць Таццяна. — Але пасля прымянення балончыка яны становяцца больш рахманыя. На самай справе мы стараемся пазбегнуць прымянення любой фізічнай сілы, спрабуем дамаўляцца. На гэтай рабоце трэба заўсёды ўдасканальвацца ва ўменні знаходзіць патрэбныя словы, адчуваць настрой чалавека, каб пазбегнуць канфліктаў.

## Першы шок

Да нашай размовы далучаецца Віталь, напарнік Таццяны. Ён задаволены сённяшнімі маршрутамі. Ёсць у міліцыянераў і няпростыя мясціны, напрыклад, Камароўка.

— Там з пачатку змены могуць сапсаваць настрой, — прызнаецца Віталь. — У нашы абавязкі не ўваходзіць «ганяць» бабулек, якія гандлююць кропам, наша задача глядзець за парадкам, каб ніхто не распіваў алкагольныя напоі ў грамадскім месцы, каб не ўчынялі бойкі. Але бабулі гэтага не разумеюць. Могуць падысці ды аблаяць нас. Мы стараемся іх супакоіць, але настрой у такіх выпадках ужо сапсаваны.

Мы ідзём у напрамку плошчы Бангалор. Там два маршруты. Адзін спакойны, другі міма «праблемнага дома».

— Многія жыхары гэтага дома людзі пітушчыя, — тлумачыць Таццяна. — Таму міліцыя тут часты госць.

Жанчына ўспамінае свой першы выклік пасля «вучэбкі». Нічога асаблівага, звычайны рабочы момант: суседзі выклікалі на шум у кватэры, маўляў, сямейны скандал. Прыйшлі на адрас, без праблем зайшлі ў кватэру — дзверы адчыненыя. Здалося ўсё спакойна ў аднапакаёвай кватэры. У жылым пакоі сядзіць ужо немаладая жанчына — «бічоўка» ( «былы інтэлігентны чалавек» на міліцэйскім слэнгу, чалавек, па знешніх прыкметах якога відаць, што любіць выпіць). Яна глядзіць «Поле цудаў» па тэлевізары і чысціць моркву.

— Пытаемся ў яе, маўляў, што здарылася, — успамінае Таццяна. — А яна адказвае, што нічога страшнага, пасварыліся з дачкой ды і ўсё, яна на кухні — там з ёй і пагаворыце. Мы з напарнікам заходзім на кухню, а гэта і не кухня, а быццам бы маленькі пакойчык. Стаіць ложак, на якім спружынны матрац, а спружыны гэтыя ўжо бачныя, «выйшлі» і прабілі тканіну. На ложку ляжыць дзяўчына, стогне і нешта там мармыча. Матрац у крыві. Мы кінуліся да яе аказваць дапамогу. Выклікалі «хуткую» і падмацаванне. Адразу было зразумела, хто гэта зрабіў. Дапамагаць было страшна, мы ж не ведалі, чым дзяўчына хварэе. У нас, канешне, ёсць спецыяльныя пальчаткі, у якіх мы працуем у такіх выпадках. Мы рабілі ўсё як трэба. Побач круцілася яшчэ маці, якая зразумела, што яна цяпер наўрад ці дагледзіць сваю любімую перадачу. Я была ў шоку тады ад здарэння. Скончылася гісторыя тым, што агрэсіўную маці пасадзілі, не дачку ўдалося выратаваць.

## На варце парадку

Раптам Таццяна спыняецца і заходзіць на агароджаную пляцоўку для смеццевых кантэйнераў.

— Ну і добра, — выдыхае яна з палёгкай. — Тут звычайна спіць п'яны мужчына. Заўсёды вітаюся з ім. Ведае, што зараз мая змена.

Падыходзім да праблемнага дома, і я бачу, як людзі, якія сядзелі на лаўцы аднаго з пад'ездаў, хуценька рэціруюцца. Наблізіўшыся, мы бачым пустую лаўку і за шклом пад'ездных акенцаў сілуэты ўцекачоў. Таццяна і Віталь шчыра смяюцца.

— Глядзіце, як дзеці малыя пахаваліся, — заўважае Таццяна.

Увогуле, людзі, якія маюць залежнасці і судзімасці, нібыта скурай адчуваюць набліжэнне міліцыі. Бывае, канешне, што яны нават разам смяюцца, але скрозь слёзы. Так аднойчы ўбачыла Таццяна падазроную жанчыну здалёк, якая ўжо не раз пападалася на крадзяжы. Яна нешта цягнула ў торбе. Згледзеўшы праваахоўнікаў, імгненна падкінула цяжкую торбу ўверх і пабегла. Але раптам не ўпісалася ў паварот і ўпала ў кусты, з якіх самастойна ўжо не змагла выбрацца. І вось падыходзяць Таццяна з напарнікам да кустоў, а там сядзіць гора-зладзейка і так шчыра смяецца... Папалася, што ўжо зробіш.

Спыняемся каля іншага пад'езда, бачым мужчыну, які стараецца падняцца з лаўкі, але ногі яго не слухаюцца. Патрульныя дапамагаюць і даводзяць да дзвярэй. Заходзім, а там яшчэ двое. Трымаюцца адзін за аднаго.

— Ну, і як гэта разумець? — абуранна пытаецца ў іх Таццяна.

— Тттаняяаа! — адказвае адзін з іх. — Мы ўжо дадому.

— Ну, ты ж толькі прыехаў з выцвярэзніка, — гаворыць патрульная. — Што гэта такое! Ты ж на нагах не стаіш. Закусвайце хаця б!

— Тання — 28 ггггадоў! — адказвае мужчына. — Табе 28! І я цябе ўжо запомніў! Больш не буду, зараз сыходжу...

Пачынае спускацца па лесвіцы ўніз.

— Ды не туды, — гаворыць Таццяна. — Наверх ідзі. Ты там жывеш.

Мужчыны ідуць наверх. Мы выходзім з пад'езда.

— Няўжо гэта прыемна, калі цябе ведае кожны выпівоха на раёне? — пытаюся ў Таццяны.

— Ну, што зробіш. Работа такая, — адказвае дзяўчына. — Але мяне ведаюць не толькі алкаголікі. Яшчэ мяне ведаюць бацькі, якім дапамагала знайсці іх малых, што згубіліся ў горадзе. Ведаюць мяне дарослыя, якім я прыводзіла іх пажылых хворых бацькоў дадому. Ведаюць мяне і людзі, якім стала дрэнна на вуліцы, і мы своечасова аказалі дапамогу. Разумееце, я адчуваю сябе на сваім месцы. Мне падабаецца, калі людзі побач са мной адчуваюць сябе ў бяспецы.

Я развітваюся з міліцыянерамі і гляджу, як яны бадзёра ідуць далей, па маршруце. Падумалася, што і сапраўды Таццяна шчаслівая. Яна знайшла сваё прызванне.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

---

Ну і ну!

## АЎТАЖАРСЦІ ПА-ЗА ЎЗРОСТАМ

**62-гадовая сужыцелька пасля сваркі падрапала аўто 49-гадовага мінчаніна.**

У аператыўна-дзяжурную службу Партызанскага РУУС сталіцы паступіла паведамленне аб пашкоджанні аўтамабіля Nissan Almera. На месцы здарэння міліцыянеры ўстанавілі, што машына належыць 49-гадоваму жыхару сталіцы.

У ходзе апытання ўладальніка аўто стала вядома, што свой транспартны сродак мужчына прыпаркаваў каля месца работы па вуліцы Аннаева і, калі рабочы дзень падышоў да канца, выявіў пашкоджанні на ім.

Далей супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку высветлілі, што аўтамабіль пашкодзіла былая 62-гадовая сужыцелька заяўніка. Жанчына растлумачыла, што напярэдадні пасварылася з каханым. Яна ведала, дзе працуе мужчына, і прыехала да яго на работу. Убачыўшы аўтамабіль, вырашыла адпомсціць і нанесла драпіны на капот і дзверы. Пасля гэтага з'ехала да маці ў Жодзіна, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.

Паводле ацэнкі экспертаў, агульная сума шкоды склала 1600 рублёў. Вядома, што раней жанчына да крымінальнай адказнасці не прыцягвалася.

## ЗАТРЫМАЛІ МАЦЁРЫХ БРАКАНЬЕРАЎ

### А зброю — абрэз «выдаў»... дамашні казёл

**Дваіх аршанцаў, якія лавілі рыбу сеткамі на Дняпры, затрымалі дзяржінспектары ў Дубровенскім раёне. Сістэмныя браканьеры некаторы час таму трапілі ў распрацоўку Віцебскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. За мясцовасцю, дзе яны могуць рыбачыць, вялі назіранне. Падчас чарговай незаконнай вылазкі іх узялі з доказамі злачынства.**

Месца для «рыбалкі» парушальнікі выбралі ціхае, без людзей — трансгранічны ўчастак Дняпра каля вёскі Барствінава. Тут проста па рацэ праходзіць мяжа з Расіяй. «Прафесійны» падыход адчуваўся ва ўсім: на беразе рыбакі-нелегалы збудавалі ўласны домік, выкарыстоўвалі лодку з маторам і асаблівыя прылады лоўлі. Канфіскаваная ў іх 90-метровая сетка — не танная «кітайка», а эксклюзіўны выраб, па-майстэрску сплецены з трывалай капронавай ніткі, паведамілі ў Дзяржінспекцыі. З дапамогай яе браканьеры вылавілі 14 кілаграмаў рыбы, гэтага аказалася дастаткова, каб парушэнне набыло крымінальны характар.

Адзін з затрыманых у далёкім мінулым сам працаваў у органах прыродаахоўы, іншы — дыпламаваны юрыст, тым не менш ён аказаў непадпарадкаванне дзяржінспектару, выкінуў частку ўлову і паспрабаваў збегчы ўплаў, чым толькі пагоршыў сваё становішча.

Пасля таго як была заведзена крымінальная справа і праведзены вобыск двух дамоў у вёсцы Барствінава, стала ясна: зараблялі браканьеры не толькі сеткамі. Праваахоўнікі выявілі электравуду і тры камплекты абсталявання для электралавільных прылад, а таксама абрэз паляўнічай стрэльбы, зараджаны двума патронамі. Знайсці схаваную зброю дапамог хатні гадаванец — казёл, які выкацій з зацішнага месца пластыкавую бочку, у якой ляжаў абрэз. У дадатак да ўсяго ў дамах і гаспадарчых пабудовах знайшлі яшчэ 28 рыбалоўных сетак.

Рыбакоў-нелегалаў заключылі пад варту, яны прызналі факт незаконнага рыбалоўства і ўжо пакрылі 2,6 тысячы рублёў. Прызначана экспертыза па зброі, яе мадыфікацыя — таксама нагода для крымінальнага перасьледу.

## СЯМЕЙНАЯ ПАРА АБРАБАВАЛА ДЫСКАЎНТАР

**Удзень па тэлефоне «102» у дзяжурную службу УУС аблвыканкама звярнулася прадавец крамы «Востраў чысціні», які знаходзіцца на Маскоўскім праспекце ў Віцебску. Яна паведаміла, што пяць хвілін таму невядомыя злачынцы выкралі з гандлёвага аб'екта прадметы асабістай гігіены.**

Як устанавілі аператыўнікі, у краму зайшла парачка. Пакуль мужчына чакаў сваю спадарожніцу каля ўваходу, жанчына рушыла ўнутр памяшкання. Там яна пачала аглядаць тавар і сёе-тое класці сабе ў пакет. Іншую частку прадукцыі дама стала хаваць пад адзеннем. Ахоўнік заўважыў гэта і прапанаваў ёй выкласці скрадзеныя прадметы. Зладзейка пераклала ўсё ў пакет і стала рухацца да выхаду. Калі ахоўнік паспрабаваў яе спыніць, кампаньён жанчыны схапіў яго і ўтрымліваў, пакуль тая не збегла з месца здарэння. Пасля гэтага мужчына таксама рэціраваўся.

Супрацоўнікі міліцыі па гарачых слядах затрымалі рабаўнікоў. Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, аказалася, што злачынства здзейснілі непрацуючыя муж і жонка 1979 і 1964 гадоў нараджэння. Парачка была затрыманая, выкрадзенае з крамы — канфіскавана. У дачыненні да іх заведзена крымінальная справа за рабаванне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

### по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Жеребковичи»

| Наименование недвижимого имущества | Местонахождение недвижимого имущества | Сведения о недвижимом имуществе / информация о земельном участке | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка |
|---|---|---|---|
| **Здание сельского дома культуры** | Брестская область, Ляховичский р-н, д. Своятичи, ул. Орловского, 57 | Здание 2-эт., кирпичное, 1974 г. п, площадь – 1099,9 кв. м, один бетонный подвальный этаж. Земельный участок площадью 0,1345 га, целевое назначение – для обслуживания сельского дома культуры, ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0030 га | |

**Продавец недвижимого имущества –** ОАО «Жеребковичи» Ляховичского района Брестской области, тел.: 8 016 33 4 52 23; 4 52 44.
**Начальная цена недвижимого имущества – 9 646 руб. 90 коп.**
**Сумма задатка – 1000 руб. 00 коп.**
**Реквизиты счета для перечисления задатка:**
р/с BY76BAPB30124500800110000000 ЦБУ № 135 г. Ляховичи, Региональная дирекция по Брестской области ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНН 200058414, ОКПО 03802510, получатель платежа – ОАО «Жеребковичи», срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона

**Организатор аукциона –** ОАО «Жеребковичи» Ляховичского района Брестской области, тел.: 801633 4 52 23; 4 52 44

Повторный аукцион назначен на **7 октября 2019 года** в 11.00 по адресу: Брестская область, Ляховичский район, аг. Жеребковичи, ул. Минская, 6а (административное здание общества).
Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол в день аукциона; в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.
Лицом, приравненным к победителю аукциона, считается единственный участник аукциона, давший согласие на покупку предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %.
Договор купли-продажи с победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона. Условие оплаты – в течение 5 рабочих дней с момента подписания договора. По соглашению сторон возможно предоставление рассрочки оплаты.
Порядок оформления участия в аукционе и его проведение определятся Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов, находящихся в собственности ОАО «Жеребковичи».
Извещение с подробной информацией об участии в аукционе, условиях ранее опубликовано в газете «Звязда» за 04.10.2018 г.

*Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: Брестская область, Ляховичский район, аг. Жеребковичи, ул. Минская, 6а, ОАО «Жеребковичи» по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 5 октября 2019 года включительно.*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Лот 1: – капитальное строение, инв. № 412/С-9025 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – одноэтажное кирпичное здание магазина), площадью 329,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Пролетарская, 1; капитальное строение, инв. № 412/С-26562 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – наружная канализационная сеть магазина), протяженностью 23,7 м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Пролетарская, 1, наружная канализационная сеть магазина; капитальное строение, инв. № 412/С-26561 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – наружная водопроводная сеть), протяженностью 113,0 м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Пролетарская, 1, наружная водопроводная сеть магазина

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый номер 424050100016000024 (назначение – обслуживание здания магазина), площадью 0,0594 га, расположенном по адресу: г. Мосты, ул. Пролетарская, 1

Начальная цена продажи – 56 000 руб. (пятьдесят шесть тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 5 600 руб. (пять тысяч шестьсот рублей)

Продавец – Гроднооблпотребобщество (Мостовский филиал), 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1
тел./факс 8-01515-325-22

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

